Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

4 ЛІПЕНЯ 2017 г. АЎТОРАК №125 (28489)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 ліпеня краіна адзначыла Дзень Незалежнасці — галоўнае свята беларускай дзяржаўнасці

Рашэнне аб святкаванні Дня Незалежнасці 3 ліпеня было прынята ў 1996 годзе — так прагаласавалі беларусы на рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада. У снежні таго ж года дэкрэтам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ўстаноўлена дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі). Яно адзначаецца ў дзень вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — 3 ліпеня 1944 года. Упершыню Беларусь адзначыла Дзень Незалежнасці ў 1997 годзе.

Беларусі першай давялося прыняць на сябе ўдары гітлераўскіх полчышчаў, а Мінск на другі дзень вайны трапіў пад бязлітасную бамбардзіроўку і артылерыйскі абстрэл. На подступах да горада гітлераўцы сустрэлі ўпартае супраціўленне. Асабліва мужна змагаліся з ворагам 100-я і 64-я стралковыя дывізіі. Але 28 чэрвеня фашыстам удалося авалодаць Мінскам. З першых дзён акупацыі жыхары горада падняліся на барацьбу з ворагам. 1100 дзён акупацыі — 1100 дзён самаадданай, гераічнай барацьбы з гітлераўскімі захопнікамі. Мінск быў акупіраваны, але не пакораны.

У выніку бліскучай Беларускай аперацыі пры ўзаемадзеянні 1-га і 3-га Беларускіх франтоў і пры падтрымцы партызан 3 ліпеня 1944 года сталіца Беларусі была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэты дзень стаў святам вызвалення ўсёй краіны. У Беларусі ведаюць цану свабодзе: у Вялікай Айчыннай вайне за яе загінуў кожны трэці жыхар краіны.

Традыцыйна 3 ліпеня беларускі народ аддае даніну павагі гераізму і стойкасці салдат, самаадданай барацьбе падпольшчыкаў і партызан, бяспрыкладнаму працоўнаму подзвігу тых, хто паднімаў краіну з руін.

БЕЛАРУСЬ АДБЫЛАСЯ ЯК НЕЗАЛЕЖНАЯ ДЗЯРЖАВА

Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі на парадзе ў гонар Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дня Рэспублікі)

Фота БЕЛТА.

Таварышы салдаты, сяржанты, прапаршчыкі і афіцэры!

Дарагія ветэраны!

Паважаныя суайчыннікі і госці!

Сёння наша краіна святкуе Дзень Незалежнасці. Адзначаць галоўнае дзяржаўнае свята менавіта сёння, 3 ліпеня, мы сталі па волі нашага народа. Гэты выбар сведчыць аб гістарычнай памяці беларусаў і пераемнасці пакаленняў. У нашых сэрцах незалежнасць Беларусі непарыўна звязана з яе вызваленнем ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Мы ніколі не забудзем тых, каму абавязаны пазбаўленнем ад нацысцкага прыгнёту. Вялікая Перамога была атрымана дзякуючы гераізму воінаў Чырвонай Арміі і працаўнікоў тылу, стойкасці і адзінству ўсіх савецкіх людзей.

Велізарны ўклад у разгром фашызму ўнёс беларускі народ. Гэта было прызнана сусветнай супольнасцю. Таму наша рэспубліка па праве ўвайшла ў лік дзяржаў, якія заснавалі Арганізацыю Аб'яднаных Нацый.

Мы гордыя тым, што Беларусь адбылася як незалежная дзяржава, якая праводзіць міралюбівую шматвектарную знешнюю палітыку. Наш нязменны прынцып: роўнасць усіх краін і іх неўмяшанне ва ўнутраныя справы адна адной. Мы выступаем за вырашэнне любых міжнародных канфліктаў выключна за сталом перагавораў.

На жаль, іншыя краіны не пажадалі пераняць такі прыклад. Да чаго гэта прывяло? Ідзе нарастанне глабальнай нестабільнасці. Міжнародная бяспека разбурана. На шлях мілітарызацыі ўступілі краіны Еўропы. Яны ўцягваюцца ў гонку ўзбраенняў і ваенныя прыгатаванні. Злучаныя Штаты Амерыкі разгортваюць тут, каля нашых граніц, сістэму проціракетнай абароны і ўдасканальваюць свой ядзерны патэнцыял.

Наш адказ — сучасная беларуская армія. Яна пастаянна мадэрнізуецца, мабільная, абучаная і ўзброеная.

Важна адзначыць, што важкі ўклад у павышэнне боегатоўнасці Беларусі ўносіць айчынны абаронна-прамысловы комплекс.

У краіне паспяхова развіваецца ўласнае ракетабудаванне. Можна назваць больш за сотню ўзораў беларускіх вырабаў ваеннага прызначэння, якія ўяўляюць сабой прынцыпова новую, інавацыйную прадукцыю.

Баявы арсенал, якім мы валодаем, сёння будзе паказаны ў час параднага маршу. Кожны зможа пераканацца: у нас ёсць усё неабходнае, каб даць адпор любому агрэсару.

Палітыка Беларусі мае адкрыты характар. Нам няма чаго ўтойваць. Разам з брацкай Расіяй мы абараняем межы ствараемай намі Саюзнай дзяржавы.

Нашай стратэгічнай мэтай з'яўляецца далейшае развіццё адносін з дзяржавамі — членамі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Гэта нашы надзейныя партнёры і верныя сябры. Мы звязаны агульнай гісторыяй і разам сёння абараняем свет ад новых пагроз.

У гэты святочны дзень хачу звярнуцца да вас, паважаныя ветэраны! Вы не далі паставіць нашу краіну на калені ў гады самай страшэннай вайны, прынеслі свабоду роднай зямлі. Мы ганарымся вамі і імкнёмся быць дастойнымі слаўнага пакалення пераможцаў.

Дарагія суайчыннікі!

У гэты свяшчэнны для кожнага з нас дзень жадаю вам шчасця, здароўя і дабрабыту, мірнага неба і поспехаў у працы на карысць нашай роднай Беларусі.

Слава героям, якія абаранілі Радзіму ў жорсткіх бітвах!

Слава працаўнікам, якія адрадзілі краіну з попелу і ператварылі яе ў цудоўны край!

Слава беларускай арміі — гаранту непарушнасці рубяжоў Айчыны!

Слава беларускаму народу!

Са святам! З Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь!

Ура!

Мы заслужылі права жыць на вольнай зямлі, у міры і дастатку

1 ліпеня ў Мінску адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае Дню Незалежнасці Беларусі, на якім выступіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка

Фота БЕЛТА.

«Гісторыя беларускай дзяржаўнасці заўсёды была няпростай. Але імкненне нашага народа жыць у сваім доме было стрыжнем, які даваў сілу і мацаваў яго дух», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Пра асновы беларускай дзяржавы

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў краіне памятаюць пра тых асветнікаў і падзвіжнікаў, якія стаялі каля вытокаў беларускай дзяржаўнасці. У іх ліку такія выбітныя землякі, як Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына, Сымон Будны.

Паводле слоў Прэзідэнта, у жыцці любога народа існуюць вехі, якія вызначаюць яго лёс, а асновы беларускай дзяржавы зарадзіліся яшчэ ў далёкім дзявятым стагоддзі.

«Ужо тады, 1155 гадоў назад, Полацк быў вядомым гандлёвым і адміністрацыйным цэнтрам славянскай Еўропы. А Полацкае княства — наша гістарычная калыска — мірнай, працавітай і прыязнай дзяржавай. Ужо тады яго жыхары самастойна вызначалі свой лёс. На народным вечы выбіралі правадыроў з ліку самых мужных і мудрых прадстаўнікоў сваёй зямлі, — сказаў беларускі лідар. — А ў той час да многіх народаў дзяржаўнасць прыйшла разам з варагамі. Далёка не ўсім было даспадобы імкненне нашых продкаў быць самастойнымі. Таму абараняць сваю зямлю ім даводзілася на працягу ўсёй яе гісторыі».

Пра сапраўдную крыніцу незалежнасці

Прэзідэнт адзначыў, што ідэя нацыянальнай дзяржавы прахадзіла чырвонай ніткай праз усе пакаленні. Нягледзячы на шматлікія войны, палітычныя і эканамічныя ўзрушэнні, беларускі народ выстаяў, не знік з гістарычнай авансцэны. Наадварот, кожны няпросты перыяд узбагачаў гэтую ідэю сваім зместам, захоўваў і ўмацоўваў яе, даваў сілы для новага этапу развіцця.

Вялікае Княства Літоўскае, напрыклад, надало магутны імпульс горадабудаўніцтву і ваеннай дзейнасці, падарыла Еўропе самую прагрэсіўную для таго часу юрыдычную думку — напісаны на старабеларускай мове Статут. «Значна раней за многіх нашых суседзяў — 500 гадоў таму — мы авалодалі друкаваным словам», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што беларускія землі былі і часткай буйных імперый, і гэта асабліва трагічныя старонкі гісторыі народа.

СТАР. 3

ВІНШАВАННІ БЕЛАРУСКАМУ НАРОДУ

Віншаванні з Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь паступаюць у адрас кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ад кіраўнікоў замежных дзяржаў, замежных дзеячаў палітыкі і культур, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Віншавальныя пасланні атрыманы ад многіх кіраўнікоў краін СНД, Еўрапейскага саюза і іншых замежных лідараў. У іх ліку Папа Рымскі Францыск, Каралева Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Лізавета II, Імператар Японіі Акіхіта, Кароль Швецыі Карл XVI Густаў, Кароль Іарданіі Абдала II.

Кіраўніка беларускай дзяржавы таксама павіншавалі прэзідэнты Расіі, Украіны, Малдовы, Туркменістана, Таджыкістана, Кыргызстана, Германіі, Балгарыі, Венгрыі, Румыніі, ААЭ, Індыі, В'етнама, Манголіі, ПАР, Алжыра, Старшыня Дзяржаўнага савета і Савета Міністраў Кубы, генерал-губернатары Канады і Аўстралійскага саюза.

■ Рэха падзеі

БЫЦЬ ДАСТОЙНЫМІ НАШЧАДКАМІ ПАКАЛЕННЯ ПЕРАМОЖЦАЎ

Беларусы ганарацца сваёй гісторыяй і гатовы абараняць родную зямлю ад пагроз яе суверэнітэту і незалежнасці

«Увага! Гаворыць і паказвае горад-герой Мінск!» — ужо каторы год запар у Дзень Незалежнасці, які мы ўжо дваццаты раз святкуем яшчэ і як Дзень Рэспублікі, адзін з цэнтральных праспектаў замірае ў прадчуванні найвялікшай урачыстасці. Менавіта тут, каля мемарыяльнага комплексу «Мінск — горад-герой», які сімвалізуе мужнасць і стойкасць абаронцаў беларускай сталіцы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, па традыцыі праходзіць галоўнае шэсце краіны.

Штогод побач з тымі, хто ў далёкім 1944-м адстаяў для нас Незалежнасць, а таксама з нашчадкамі пакалення Пераможцаў — і карэспандэнты найстарэйшай рэспубліканскай газеты Беларусі. «Звязда» ў найбольш трагічны ў гісторыі нашага народа час не здалася ворагу, актыўна ўступіўшы з ім у барацьбу ва ўмовах і падполля.

ПАМЯТАЕМ І ГАНАРЫМСЯ

Адной з галоўных урачыстасцяў краіны па традыцыі стаў ваенны парад. Тысячы мінчан, а таксама госці сталіцы, якія апынуліся ў эпіцэнтры святкавання Дня Незалежнасці, асабіста пераканаліся, што беларуская армія — мабільная, моцная духам, добра падрыхтаваная, на яе ўзбраенне накіроўваецца самая сучасная тэхніка.

— Дай Чырвонай Арміі гэтую тэхніку ў вайну, ужо праз тры дні прагналі б фашыстаў з нашай зямлі! — ці то жартам, ці то не кажа малалетні вязень Аляксандра Піцукевіч, якая пасля вызвалення рэгулярнымі войскамі аказвала медыцынскую дапамогу на перадавой.

А тым часам галоўнае шэсце краіны пачынаецца з традыцыйнай перадачы парада. Каб «прыняць» і «перадаць» парад, міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй Раўкоў і камандуючы парадам, намеснік міністра абароны генерал-маёр Сяргей Патапенка выехалі на кітайскіх кабрыялетах. Эксклюзіўныя аўтамабілі, якія існуюць толькі ў двух экзэмплярах, удзельнічаюць у парадзе трэці год запар. Такі падарунак да 70-й гадавіны Вялікай Перамогі нам зрабіла ваеннае ведамства Кітая.

Камандуючы парадам дакладвае міністру абароны аб гатоўнасці войскаў Мінскага гарнізона да парада ў азнаменаванне Дня Незалежнасці. Пачынаецца аб'езд войскаў. Міністр вітае кожную парадную «каробку» — не змаўкаюць трохразовыя «ўра». Міністр абароны дакладвае Галоўнакамандуючаму Узброенымі Сіламі, Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку, што войскі Мінскага гарнізона гатовы для ўдзелу ў парадзе. Апошняе трохразовае «ўра» — пад акампанемент артылерыйскіх залпаў гучыць Дзяржаўны гімн.

У СТРАІ — АБАРОНЦЫ АЙЧЫНЫ

Ужо каторы год першымі на праспект Машэрава выходзяць самыя юныя ўдзельнікі ваеннага парада — мінскія суворавцы. Барабаншчыкі чаканяць крок, а дыктар удакладняе, што сёлета адбыўся 61-ы выпуск ваеннага вучылішча. Увогуле за сваю гісторыю пуцёўку ў самастойнае жыццё атрымалі больш як 13 тысяч выхаванцаў Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча. Сотні яго выпускнікоў за праяўленыя мужнасць і гераізм узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі, шасцёра навечна залічаны ў спісы асабовага складу ўстановы.

Перад трыбунамі праносяць Сцяг Перамогі, сцягі Рэспублікі Беларусь, Савецкага Саюза — краіны, якая ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўнесла асноўны ўклад у перамогу над фашызмам. Вайскоўцы роты ганаровай варты нясуць і штандары 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх, 1-га Прыбалтыйскага франтоў — менавіта гэтыя вайсковыя злучэнні ўдзельнічалі ў Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Багацыён», у ходзе якой была вызвалена наша краіна.

Непасрэдным удзельнікам легендарнай аперацыі, за якую атрымаў ордэн Аляксандра Неўскага, быў і Аляксандр Фень. Больш як 70 гадоў таму на досвітку 3 ліпеня з боку Астрашыцкага Гарадка ў складзе свайго танкавага экіпажа ён набліжаўся да беларускай сталіцы. За плячамі ўжо былі Сталінград, Курск, Украіна, а напярэдзе — Румынія, Літва, Латвія. Перамогу сустрэў ва Усходняй Прусіі. За гады ваеннага ліхалецця Аляксандр Фёдаравіч асабіста знішчыў 12 танкаў праціўніка. На парадным кіцелі франтавіка — 7 баявых ордэнаў і 28 медалёў!

Аддаючы даніну павагі ветэранам-пераможцам, перад трыбунамі ў форме чырвонаармейцаў часоў Вялікай Айчыннай вайны праходзіць парадны разлік курсантаў агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі — так званая франтавая каробка. У руках курсантаў — легендарныя савецкія аўтаматы ППШ.

Упершыню ў парадным страі — прадстаўнікі войскаў тэрытарыяльнай абароны, якія сімвалізуюць усенародны характар абароны Айчыны.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

БЫЦЬ ДАСТОЙНЫМІ НАШЧАДКАМІ ПАКАЛЕННЯ ПЕРАМОЖЦАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Урачыстым маршам з Баявым Сцягам галоўнай ваеннай ВНУ краіны ідзе парадны разлік афіцэраў камандна-штабнога факультэта і прафесарска-выкладчыцкі склад Ваеннай акадэміі. На чале параднага разліку — начальнік установы генерал-маёр Віктар Лісоўскі. Адзін за адным крочаць курсанты факультэта сувязі і аўтаматызаваных сістэм кіравання, факультэта ракетных войскаў і артылерыі, авіяцыйнага факультэта і факультэта ваеннай разведкі. Штогод у парадзе ўдзельнічаюць і курсанты ваенна-тэхнічнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Прыведзеныя ў адпаведнасць з патрабаваннямі сучаснай вайны і ўзброенай барацьбы, Узброеныя Сілы нашай краіны захавалі лепшыя воінскія злучэнні, якія за мужнасць і гераізм у гады Вялікай Айчыннай вайны атрымалі званні гвардзейскіх і ганаровыя найменні, узнагароджаныя баявымі ордэнамі. Упершыню на парадзе — усе механізаваныя брыгады сухапутных войскаў. У кожнага са злучэнняў — слаўны баявы шлях.

Сцяг сухапутных войскаў нясуць вайскоўцы 120-й асобнай гвардзейскай Рагачоўскай Чырванасцяжнай, ордэнаў Суворава і Кутузава механізаваная брыгады імя Вярхоўнага Савета БССР. У гады ваеннага ліхалецця вайскоўцы злучэння прайшлі ад Сталінграда да Берліна, удзельнічалі ў вызваленні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў роднай Беларусі. У парадным разліку — прадстаўнікі 11-й асобнай гвардзейскай Прыкарпацка-Берлінскай Чырванасцяжнай, ордэна Суворава 2-й ступені механізаванай брыгады. Іх папярэднікі абаранялі сваю краіну на палях Курскай бітвы, вызвалялі Украіну, Польшчу, бралі Берлін. Прыкладам беззапаветнага служэння Айчыне з'яўляюцца і 19-я асобная гвардзейская Мікалаеўска-Будапешцкая Чырванасцяжная, ордэна Суворава, а таксама 6-я асобная гвардзейская Кіеўска-Берлінская, ордэна Леніна, Чырванасцяжная, ордэнаў Суворава і Багдана Хмяльніцкага механізаваныя брыгады, вайскоўцы якіх таксама ўдзельнічаюць у парадзе.

— Я і цяпер помню, як хваляваўся, — прызнаецца Дзмітрый. — Удзельнічаць у парадзе — гонар для кожнага вайскоўца, такое не забудзеш ніколі!

Запамінальнай гэтая падзея стане і для курсантаў факультэта супрацьпаветранай абароны Ваеннай акадэміі, якія прадстаўляюць Ваенна-паветраныя сілы і войскі супрацьпаветранай абароны. Штодзень вайскоўцы гэтага віду Узброеных Сіл нясуць баявое дзяжурства па ахове паветраных меж нашай Радзімы. Урачыстым маршам крочыць і парадны разлік курсантаў Інстытута пагранічнай службы, які ўзначальвае начальнік навучальнай установы генерал-маёр Васіль Гедзько. Выпускнікі інстытута стаяць на варце беларускай мяжы, надзейна забяспечваючы ахову рубяжоў нашай дзяржавы.

Набліжаюцца прадстаўнікі ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў. Першымі ідуць курсанты факультэта ўнутраных войскаў Ваеннай акадэміі. У парадным страі — і воіны 3-й асобнай Чырванасцяжнай брыгады спецыяльнага прызначэння ўнутраных войскаў МУС. У гады Вялікай Айчыннай брыгада прымала

некалькі гадоў на яго выпускнікоў будзе ўскладзена адказная місія па выратаванні жыцця і здароўя грамадзян, прадухіленні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, а таксама іх наступстваў.

У парадным страі — гонар Узброеных Сіл Беларусі. Сілы спецыяльных аперацый прадстаўлены сёлета ў поўным складзе: 38-й асобнай гвардзейскай Венскай, Чырванасцяжнай дэсантна-штурмавой, 103-й асобнай гвардзейскай ордэна Леніна, Чырванасцяжнай, ордэна Кутузава паветрана-дэсантнай імя 60-годдзя СССР брыгадамі, а таксама 5-й асобнай брыгадай спецыяльнага прызначэння, вайскоўцы якой выконваюць найбольш складаныя і адказныя спецыяльныя задачы.

ТАКОЕ НЕ ЗАБУДЗЕШ

Каб на ўласныя вочы ўбачыць прыгожых хлопцаў, якія зладжана трымаюць раўненне, Дзмітрый Аляхновіч з жонкай Ганнай і дачкой Арынай другі год запар спецыяльна прыязджаюць у сталіцу з Гродна. Аказваецца, галава сям'і некалькі гадоў быў сам на іх месцы — чаканіў крок у складзе разліку ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў.

ўдзел у вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пасля вайны змагалася з бандытамі на тэрыторыі нашай краіны і ў Заходняй Украіне. Сёння нашчадкі пераможцаў адказваюць за ахову грамадскага парадку.

Са сцягам ведамства праходзіць парадны разлік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, прадстаўлены курсантамі Універсітэта грамадзянскай абароны МНС на чале з начальнікам установы палкоўнікам Іванам Паляводам. Праз

ЖАЛЕЗНАЯ ГАРАНТЫЯ БЯСПЕКІ

Аб тым, што беларуская армія актыўна развіваецца, сведчыць і той факт, што рэгулярна ў войскі трапляюць новае ўзбраенне і тэхніка — мадэрнізаваная і якая толькі што сышла са станка. Нямала навінак, прычым айчыннага ваенна-прамысловага комплексу, убачылі і гледачы парада.

Але перш у складзе механізаванай калоны на праспект выехаў легендарны савецкі танк, які ўжо даўно ахрысцілі танкам Перамогі. Пад камандаваннем гвардыі малодшага лейтэнанта Дзмітрыя Фролікава 3 ліпеня 1944 года Т-34-85 першы ўварваўся ў беларускую сталіцу. Тое, што гэта менавіта тая трыццацьчацвёрка, сведчаць не толькі дакументы, а і прабоіны на корпусе — вораг сустрэў вызваліцеляў жорсткім супраціўленнем.

Усяго на парадзе задзейнічана звыш 220 адзінак баявой тэхнікі — у параўнанні з папярэднім годам колькасць парадных разлікаў павялічана амаль у два разы. Механізаваная калона расцягнулася на тры кіламетры.

На праспекце — танк Т-72Б, які з'яўляецца асноўным танкам сухапутных войскаў. Яго высокая абароненасць, манеўранасць і агнявая моц дазваляюць весці баявыя дзеянні ў непасрэдным судакрананні з праціўнікам. Па сваіх баявых магчымасцях і тэхнічных характарыстыках ён лічыцца адным з найлепшых танкаў — не выпадкова стаіць на ўзбраенні многіх краін свету.

Працягваюць параднае шэсце асноўныя баявыя машыны мотастралковых падраздзяленняў беларускай арміі — БМП-2. Узбраенне машыны дазваляе весці барацьбу з самымі рознымі цэлямі, уключаючы танкі і баявыя верталёты. Тэхнічнае аснашчэнне і абсталяванне могуць абараніць экіпаж у любых умовах баявой абстаноўкі.

Бронетранспарцёры БТР-80, якія стаяць на ўзбраенні дэсантных падраздзяленняў сіл спецыяльных аперацый, здольны выконваць цэлы комплекс баявых і спецыяльных задач па транспарціроўцы асабовага складу, а таксама яго агнявой падтрымцы — як на сушы, так і на вадзе. З мэтай павышэння эфектыўнасці прымянення зброі айчыннымі прадпрыемствамі распрацаваны новы прыцэльны комплекс «Манул», які паступова прайшоў выпрабаванне і ўжо паступае на ўзбраенне ў войскі.

Высокаманеўраныя пазадарожнікі «Багатыр», якія далей ідуць па праспекце, знаходзяцца на ўзбраенні сіл спецыяльных аперацый. Машыны валодаюць высокай праходнасцю, пры максімальнай нагрузцы развіваюць хуткасць да 100 кіламетраў у гадзіну. Дзякуючы айчыннym распрацоўшчыкам спектр баявых і спецыяльных задач «Багатыроў», а таксама іншай баявой тэхнікі, прадстаўленай на парадзе, значна пашыраны. Як запэўнілі арганізатары, 30% параднага разліку складаюць узоры ўзбраення і ваеннай тэхнікі, створаныя і мадэрнізаваныя на айчынных прадпрыемствах.

ПАД ГУКІ «ПАЛАНЭЗА»

— Такую колькасць ваеннай тэхнікі дагэтуль я бачыў толькі па тэлевізары, — прызнаецца госць з Фінляндыі Крысціян Карыма. — Уражвае! Увогуле ўсё, што я ведаў пра Мінск, пацвердзілася: гэта шырокія вуліцы, неверагодная чысціня, дагледжаныя помнікі, прыгожыя будынкі.

Крысціян шмат чуў пра беларускую роту ганаровай варты, таму з нецярпеннем чакае гэтага выступлення. А пакуль эксклюзіў сёлетняга парада — на мінскі праспект упершыню выехалі браніраваныя машыны «Кайман» і «Волат», радыёрэлейныя станцыі, мабільныя зенітныя артылерыйскія комплексы «Зеніт», выратавальная і медыцынская тэхніка.

Шматфункцыянальныя браніраваныя машыны «Кайман» паспяхова вытрымалі дзяржаўныя выпрабаванні і ўжо трапляюць на ўзбраенне нашай арміі. Аўтамабіль, прызначаны для разведвальных і дыверсійных аперацый, можа выкарыстоўвацца падчас патрулявання і суправаджэння, правядзення міратворчых аперацый, дзеянняў ва ўмовах надзвычайных сітуацый. Машына ўпэўнена перамяшчаецца па моцна перасечанай мясцовасці, прыдатная для бездарожжа, можа пераадолець водныя перашкоды. Па сваіх тэхнічных характарыстыках і баявых магчымасцях «Кайман» не саступае, а па шэрагу паказчыкаў нават пераўзыходзіць аналагічныя ўзоры, якія стаяць на ўзбраенні армій іншых дзяржаў.

Яшчэ адна навінка сёлетняга парада — дэманстрацыя беспілотнай тэхнікі, прычым створанай беларускімі майстрамі. Адзіны ў свеце ў гэтым класе разведвальна-ўдарны беспілотны верталёт «ІНДЭЛА СКАЙ БУР» абсталяваны оптыка-электроннай сістэмай прыцэльвання і рэактыўнымі выстралами з далёкасцю стральбы да двух кіламетраў. Унікальны беспілотны лятальны апарат BELAR падтрымлівае крэйсерскую хуткасць (300 км/г), працягласць палёту складае больш як 24 гадзіны. А беспілотныя авіяцыйныя комплексы «Грыф-100» і «Беркут-2» прызначаны для выканання задач па вядзенні паветранай разведкі.

І гонар айчыннага абаронна-прамысловага комплексу — рэактыўная сістэма залпавага агню «Паланэз». Самая магутная зброя ракетных войскаў беларускай арміі, якая ўсяго адным залпам на адлегласці да 200 кіламетраў з высокай дакладнасцю адначасова трапляе ў 48 асобных цэляў, ужо двойчы дэманстравалася падчас парадаў, але менавіта сёлета «Паланэз» упершыню паказаны шырокай публіцы як самастойны дывізіён Узброеных Сіл.

Дарэчы, па завяршэнні парада частка ваеннай тэхнікі засталася на праспекце: упершыню за гісторыю правядзення ў нашай краіне парадаў усе ахвотныя змаглі пазнаёміцца з «жалезнымі коньмі» бліжэй.

НЯБЕСНЫ ПАРАД

У небе над сталіцай — авіяцыя. Сёлета гэта не толькі асноўныя тыпы крылатых машын Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Беларусі: верталёты Мі-8МТВ-5 і Мі-24, ваенна-транспарты самалёт Ан-26 у суправаджэнні вучэбна-баявых Як-130, знішчальнікі МіГ-29. «Ромб» у небе над сталіцай выпісваюць верталёты Мі-8МТВ-5, група штурмавікоў Су-25 — такія фігуры вышэйшага пілатажу па сілах толькі прафесіяналам. А толькі такія — самыя найлепшыя лётчыкі — пілатуюць паветраныя судны ў небе над сталіцай.

Упершыню ў складзе паветранага эшалона (верталёты Мі-2 і самалёты Як-52) прадстаўлена авіяцыя ДТСААФ. Дагэтуль у парадным разліку ў небе над сталіцай не лятала і авіяцыя Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. На верталётах Мі-8, AS-355 і Мі-26, які з'яўляецца самым вялікім у свеце серыйным верталётам, «крылатыя» ратавальнікі паспяхова выконваюць самыя складаныя аварыйна-выратавальныя работы, неаднаразова ўдзельнічалі ў гуманітарных і выратавальных аперацыях у Расіі, Сербіі, Турцыі і Грэцыі.

Ужо традыцыйным у паветраным парадзе стаў удзел расійскіх лётчыкаў. Паветрана-касмічныя сілы Расійскай Федэрацыі ў небе над Мінскам сёлета прадстаўляюць верталёты Ка-52, найноўшыя франтавыя бамбардзіроўшчыкі Су-34 і самалёты Су-27.

Завяршае нябеснае шэсце ваенна-транспартны самалёт Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Беларусі Іл-76 у суправаджэнні пяці вучэбна-баявых Л-39, якія адлюстроўваюць у небе беларускі двукалор.

Мінчанка Анастасія Сівуда заварожана глядзіць у неба. Адчуваецца, што яна хвалюецца. Аказваецца, яе муж таксама ўдзельнічае ў парадзе. Не, ён не лётчык, але выконвае не менш важную задачу — забяспечвае мерапрыемства сувяззю. Як прызнаецца жанчына, ходзіць на парад па традыцыі: спачатку такім чынам падтрымлівала брата, які вучыўся ў Ваеннай акадэміі, цяпер мужа. Сёння яшчэ і хвалюецца за калег — супрацоўнікі брэнда бытавой тэхнікі «Атлант» прадстаўляюць сваю прадукцыю ў калоне тэхнікі грамадзянскага прызначэння.

Апошняя, дарэчы, прадстаўлена 102 адзінкамі тэхнікі, у тым ліку 28 выставачнымі экспазіцыямі прадпрыемстваў і канцэрнаў. Гледачы ўбачылі дасягненні айчыннага машынабудавання, нафтахімічнай і нафтаперапрацоўчай галін, аграпрамысловага комплексу, легпрама, апошнія навуковыя распрацоўкі Нацыянальнай акадэміі навук.

МАЙСТАР-КЛАС АД АРМЕЙСКАЙ ЭЛІТЫ

Завяршыў святочнае шэсце «трактарны балет»: 7 трактароў «Беларус» выпісвалі піруэты пад музыку. Але перш — выступленне зводнай роты ганаровай варты, якую па праве называюць візітнай карткай Беларусі. Без гэтых стройных і прыгожых, як на падбор, ваеннаслужачых, не абыходзіцца ні адно дзяржаўнае свята. Не стала выключэннем і галоўнае свята краіны. Разам з вайскоўцамі ў пляц-канцэрце ўдзельнічалі прадстаўнікі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта і ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў.

Дарэчы, у адпаведнасці з рашэннем Прэзідэнта Беларусі ваеннаслужачыя роты ганаровай варты пасля заканчэння тэрміновай ваеннай службы маюць права пазаконкурснага паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны.

Выступленне роты ганаровай варты сёлета было надзвычай рытмічным і відовішчным. Хутчэй за ўсё, гэта звязана з новымі элементамі, якія выконваліся не пад ваенны марш, а пад сучасную музыку беларускага кампазітара Леаніда Шырына «Фантазія». У выкананні зводнага аркестра агульнай колькасцю ў 240 чалавек пад кіраўніцтвам начальніка ваенна-аркестровай службы Узброеных Сіл — начальніка ўзорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл Беларусі, заслужанага артыста нашай краіны палкоўніка Сяргея Касцючэнкі яна напоўніла атмасферу асаблівай урачыстасцю, а кожнага з прысутных — пачуццём гонару за нашу Беларусь і яе Узброеныя Сілы.

Завяршылася ўрачыстасць тэатральным прадстаўленнем «Красуй, Беларусь!». А святочны дзень — гала-канцэртам «Беларусь маладая мая», які, як і патрыятычная акцыя «Праспяваем гімн разам», адбыўся ўвечары каля абеліска «Мінск — горад-герой». Ужо на змярканні неба расквеціў святочны салют. Галоўны дзесяціхвілінны феерверк быў надзвычай прыгожы — дзякуй Богу, а таксама нашым ветэранам, што ўжо больш як сем дзесяцігоддзяў беларусы не ведаюць іншых залпаў.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by
Фота Надзеі БУЖАН.

МЫ ВАРТЫЯ ГЭТАГА ДНЯ

Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:

— Увогуле Дзень Незалежнасці — гэта дзень вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І важна, што гэтае свята мы адзначаем менавіта 3 ліпеня. Што датычыцца эканамічнай незалежнасці, то ў нашай краіне яна забяспечваецца. На працягу некалькіх гадоў, досыць нялёгкіх у эканамічным плане, наша эканоміка пачынае падымацца крок за крокам. Мяркую, што тыя планы, прагнозы, якія краіна ставіць перад сабой, будуць выкананы.

Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:

— Незалежнасць — гэта, перш за ўсё, незалежнасць чалавека, дзяржавы. Кожны, калі зазірнуць глыбей у гісторыю, імкнецца да яе. І няхай гэта вельмі ёмістае паняцце, але для мяне гэта свабода ў выбары прафесіі, у працы.

Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:

— Шчаслівая тая краіна, што незалежная. Бо мае магчымасць будаваць сваю эканоміку, сістэму бяспекі незалежна ад знешніх фактараў. Таму тое, што робіцца сёння дзяржавай, выклікае павагу і ўхваленне. Мы выбудоўваем сваю знешнюю палітыку на аснове добрасуседства, добрапрыстойнасці, эканамічнага інтарэсу з нашымі суседзямі. Трэба даражыць тым, што нам засталося ад нашых продкаў. Памятаць, якой цаной нам дасталася гэтая незалежнасць, і рабіць усё, каб кожны чалавек жыў у свабодзе, але разумеў яе цану і здолеў яе прымножыць.

Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:

— За час незалежнасці мы сталі ў адзін рад з краінамі Еўрапейскага саюза па шэрагу пазіцый у сферы навукі. Мы таксама змаглі захаваць і прымножыць навуковы патэнцыял, аднавіць інстытуты, стварыць матэрыяльную базу, падрыхтаваць кадры, сфарміраваць новыя дзяржаўныя праграмы, сканцэнтраваць рэсурсы на прыярытэтах. Цяпер наша навука развіваецца ў кантэксце сусветных тэндэнцый і кірункаў. Гэта і касмічная сістэма, і беспілотныя лятальныя комплексы, і найноўшыя фармпрэпараты, біятэхналогіі.

Любоў ЧАРКАШЫНА, бронзавая медалістка Алімпійскіх гульняў, шматразовы сярэбраны і бронзавы прызёр чэмпіянатаў свету па мастацкай гімнастыцы:

— Для кожнай краіны важна быць незалежнай і суверэннай. І асабліва нам, як спартсменам, — прадстаўляць з гонарам Рэспубліку Беларусь, бачыць сцяг, спяваць наш гімн — гэта дарагога каштуе. Гэта прабуджае патрыятызм і імкненне, каб пра тваю Радзіму даведаліся ва ўсім свеце. Усе тыя выпрабаванні, што напаткалі наш народ, сфарміравалі беларускую нацыю, якая стала яшчэ больш мэтанакіраванай, пачала больш верыць у саму сябе. Я заўжды кажу, што мы найлепшыя, толькі ў гэта трэба паверыць! Мы можам рабіць сваю краіну яшчэ прыгажэйшай ва ўсіх сферах, і не толькі ў спорце.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

Мы заслужылі права жыць на вольнай зямлі, у міры і дастатку

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Не шкадавалі тады беларусаў. Праз нашу зямлю, праз сэрцы і душы ішлі ў розных кірунках полчышчы захопнікаў. Беларусы аказваліся ў эпіцэнтры найжорсткіх войнаў, якія ім былі зусім не патрэбныя. Бізуном выбівалі жаданне людзьмі звацца. Але даўняя мара — жыць у сваёй незалежнай дзяржаве — прабілася і праз гэтыя суровыя выпрабаванні», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт заўважыў, што наступствы Першай сусветнай вайны і рэвалюцыя 1917 года далі многім народам Еўропы магчымасць стварыць свае дзяржавы. «Гэтыя працэсы закранулі і нас. Пытанне беларускай дзяржаўнасці трывала ўвайшло ў парадак дня еўрапейскай геапалітыкі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Былі мужныя, часам утапічныя спробы самавызначэння. Некаторыя дзеячы, адухоўленыя высокімі ідэямі, так і не зразумелі таго, што незалежнасць і свабоду войскі кайзераўскай Германіі не прынясуць ніколі. Творцам незалежнасці можа быць толькі сам народ, яго воля, калектыўны розум і лідары», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Пра важнасць стварэння БССР і перамогі над фашызмам

Стварэнне Беларускай ССР Аляксандр Лукашэнка назваў важным гістарычным перыядам. Гэта палітыка-тэрытарыяльнае ўтварэнне ў складзе Савецкага Саюза не было па-сапраўднаму суверэннай дзяржавай, але мела многія атрыбуты беларускай дзяржаўнасці: сцяг, герб, Канстытуцыю, мову, органы ўлады.

«Пасля на гэтай аснове быў сфарміраваны каркас незалежнай Беларусі. Станаўленню маладой савецкай рэспублікі спрыялі масавы энтузіязм, інтэнсіўнае будаўніцтва і культурныя здзяйсненні», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што гэтае развіццё перапыніла вераломная агрэсія нацысцкай Германіі, калі на беларускую зямлю абрынуліся самыя жорсткія і бесчалавечныя выпрабаванні.

«У той вайне мы заплацілі вялікую цану. І пра гэты час нам заўсёды будуць нагадваць званы тысяч Хатыняў, безыменных магіл, лагеры смерці і гета. Бязмежная мужнасць тых, хто не схіліў галаву перад ворагам: нашых партызан, падпольшчыкаў, сотняў тысяч патрыётаў. Менавіта тады наш народ даказаў усяму свету права на жыццё. Прызнаючы лёсавызначальную ролю вызвалення краіны ад фашысцкіх захопнікаў, мы прымеркавалі галоўнае дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь — менавіта да 3 ліпеня», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пра суверэнную дзяржаву і адраджэнне пасля Чарнобыля

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, распад Савецкага Саюза прынёс велізарныя праблемы, атмасфера тых часоў — нябачаны разгул злачыннасці, эканамічная разруха, пустыя паліцы ў магазінах, збяднённе насельніцтва.

«У гэтых умовах беларускі народ агульнымі намаганнямі і неймаверная працай паспяхова пераадольваў цяжкасці і выпрабаванні, якія выпалі на яго долю. І на абломках некалі вялікай імперыі стварыў сваю першую ў гісторыі пасапраўднаму суверэнную і незалежную дзяржаву — Рэспубліку Беларусь», — адзначыў беларускі лідар.

Адной з самых страшных трагедый чалавецтва стала чарнобыльская катастрофа. «Нам, беларусам, якія прынялі асноўны ўдар гэтай аварыі, прыйшлося ў адзіночку ліквідаваць яе найцяжэйшыя наступствы. Сітуацыя здавалася бязвыхаднай. Але мы не апусцілі рукі. Прыняліся сістэмна, паслядоўна адраджаць чарнобыльскі рэгіён», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Скажу шчыра: многія сумняваліся, сцвярджалі, што гэта пустая трата сіл, часу і сродкаў. І, што граху таіць, для многіх нашых суайчыннікаў гэтая трагедыя стала палітычнай картай у іх палітычным лёсе», — заўважыў Прэзідэнт.

Абапіраючыся на народны давер, кіраўніку дзяржавы прыйшлося валявым рашэннем настаяць на правядзенні маштабных работ і ўзяць іх пад кантроль. «За мінулыя гады многае зроблена, уключаючы газіфікацыю вялікага рэгіёну і будаўніцтва дарог. І галоўнае — мы ўсялілі тады ў сэрцы людзей надзею на магчымасць нармальнага жыцця, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Цяпер тут кіпіць жыццё. Людзі працуюць, будуюць дамы, нараджаюць дзяцей».

«Рэабілітацыя паражоных Чарнобылем тэрыторый — адно з самых важных нашых дасягненняў. Гэта наш трагічны вопыт, якім сёння карыстаецца ўся планета. Ён дазволіў нам больш паверыць у сябе і яшчэ раз пераканацца: калі мы разам, то здольныя справіцца з любымі цяжкасцямі», — заявіў беларускі лідар.

Не менш значным поспехам ён назваў і пераадоленне глыбокага эканамічнага спаду і сацыяльна-палітычныя ўзрушэнні ліхіх дзевяностых. Беларусь першай на постсавецкай прасторы не толькі аднавіла даперабудоваўчы ўзровень развіцця эканомікі, але і ў два разы яго перавысіла.

Пра дасягненні незалежнай Беларусі і стаўку на эканоміку ведаў

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што маладая суверэнная краіна, не маючы вопыту, стала моцнай дзяржавай, упэўнена заявіла пра сябе ў сусветнай супольнасці. «Нас прызналі надзейным эканамічным партнёрам, прыхільнікам палітыкі добрасуседства і дружалюбнасці, — заявіў ён.

Прэзідэнт заўважыў, што сіла ў першую чаргу выявілася ў дынаміцы развіцця. У кароткія тэрміны ўдалося падняць на высокі ўзровень сельскую гаспадарку, вырашыўшы найвастрэйшую праблему харчовай бяспекі. «Без вырашэння гэтай задачы не было чаго і думаць аб суверэнітэце і незалежнасці. Бо быў час, калі мукі ў краіне заставалася ўсяго на тры дні. А зараз мы ўваходзім у лік лідараў на сусветным рынку па продажы сельгаспрадукцыі. Дзякуй за гэта ўсім працаўнікам вёскі і тым, хто прасоўвае беларускую прадукцыю», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што дасягненні незалежнай Беларусі прызнаны ў свеце. Гэта поспехі айчынных вучоных, якія дазволілі краіне стаць касмічнай дзяржавай, дасягненні вытворчага сектара, прамысловыя прадпрыемствы, якія асвойваюць новыя рынкі, і навукаёмістыя тэхналогіі.

«Нашы будаўнікі карыстаюцца даверам сур'ёзных замежных партнёраў. Сапраўднай вытворчай перамогай з'явіўся створаны іх рукамі горна-абагачальны камбінат у Туркменістане (пры 45-градуснай спякоце). Зараз найважнейшы будаўнічы аб'ект — Беларуская атамная электрастанцыя», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Мінск па праве стаў спартыўнай сталіцай Еўропы. Сёння наша краіна ўсё часцей прымае прэстыжныя спаборніцтвы самага высокага ўзроўню. У 2019 годзе ў нас пройдуць Другія Еўрапейскія гульні, а ў 2021-м — Чэмпіянат свету па хакеі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, нямала годных прыкладаў для пераймання і ў іншых сферах дзейнасці.

«Сёння мы робім стаўку на эканоміку ведаў, роля якой у сучасным свеце каласальна ўзрасла. Наша амбіцыйная, але дасягальная мэта — стварыць ІТ-краіну. Вырашэнне гэтай задачы дазволіць нам зрабіць Беларусь яшчэ больш сучаснай і квітнеючай, а беларусам — з упэўненасцю глядзець у будучыню», — заявіў беларускі лідар.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што гэта не проста амбіцыйная задача, а задача на выжыванне. Ён нагадаў, што напярэдадні Прэзідэнт Расіі сказаў, што калі расіяне і беларусы не вырашаць яе, то лёсу ў іх няма. «І я з ім абсалютна згодны. Вы бачыце, у якім напрамку развіваецца свет. Не толькі вадзіцелі не патрэбныя ў аўтамабілях — усё будзе перамяшчацца і лятаць без кіравання чалавека», — вобразна адзначыў Кіраўнік дзяржавы.

Пра галоўную каштоўнасць і станоўчую дынаміку

Прэзідэнт канстатаваў, што жыццё складаецца з узлётаў і падзенняў. «Так і ў нас. Два мінулыя гады былі вельмі складанымі. Многія гэта адчулі на сабе. Аднак народ праявіў вытрымку і, галоўнае, цярпенне, не паддаўся на пустыя лозунгі і заклікі. Мы, аб'яднаўшы намаганні, кожны на сваім месцы, добрасумленна выконвалі сваю працу. І разам змаглі пераламаць сітуацыю, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — І гэта дзякуючы таму, што мы — абсалютна зямны народ. Ніхто ніколі нічога не зробіць без неймаверных працы. І толькі той, хто будзе працаваць, зможа застацца наверсе ў гэтым жыцці на гэтай планеце. Ніяк інакш! Толькі праца, веды, адукацыя».

«Вынікі апошніх месяцаў паказваюць, што эканоміка краіны вельмі павольна і асцярожна выходзіць на патрэбную для нас станоўчую дынаміку», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

«Але галоўная наша каштоўнасць — народ. Менавіта таму дзяржаўная палітыка падпарадкавана прынцыпу: усё на карысць чалавека. Ніякія балты і гайкі дзяржаве і ўладзе не патрэбныя, калі гэта не будзе працаваць на чалавека. Гэта — кіраўніцтва да дзеяння для ўсіх органаў улады. Таму што рэспубліка з'яўляецца сапраўды народнай!» — падкрэсліў беларускі лідар.

Пра партнёраў і саюзнікаў

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што незалежнасць прадугледжвае не толькі свабоду, але ў першую чаргу і каласальную адказнасць кожнага паасобку за краіну, народ, выбар гістарычнага шляху.

«У адзіночку ў сучасным свеце, асабліва нам, не выжыць. Менавіта таму Беларусь з'яўляецца прыхільнікам міждзяржаўных інтэграцыйных працэсаў. Бо мы разумеем: здабыццё надзейных партнёраў і саюзнікаў робіць больш моцнай і ўстойлівай нашу рэальную незалежнасць», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка канкрэтызаваў, што гаворка ідзе пра двухбаковыя адносіны Беларусі і Расіі, узаемавыгаднае супрацоўніцтва з якой ахоплівае ўсе сферы жыцця. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што напярэдадні адбылося пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, на якім былі дэталёва прааналізаваны і разгледжаны найважнейшыя пытанні сучаснай работы і далейшага ўмацавання сувязяў паміж народамі дзвюх краін.

«Так, у нас з нашай брацкай Расіяй не ўсё заўсёды гладка. Але скажыце, дзе і ў каго ўсё гладка?» — задаў рытарычнае пытанне беларускі лідар.

«І я ўчора ўжо пасля правядзення ўсіх мерапрыемстваў кіраўніцтву Расіі сказаў, што гэта першае ў гісторыі падобнае мерапрыемства, дзе мы былі сапраўды братамі, дзе мы вырашылі практычна ўсе пытанні, якія стаялі і заставаліся на парадку дня», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Пасля гэтых неймаверных санкцый і ціску з усіх бакоў мы нарэшце зразумелі, што трэба разлічваць толькі на сябе. Шчасце нашым народам прынясуць толькі нашы сумесныя намаганні і больш нічога», — дадаў Прэзідэнт.

Вельмі дынамічна, прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка, развіваецца і ўзаемадзеянне з дружалюбнай Кітайскай Народнай Рэспублікай. «І гэта проста дзіўна, проста шчасце, што мы з гэтай найвялікшай імперыяй, якая выходзіць на першае месца ў свеце, устанавілі такія дружалюбныя адносіны. Яны практычна на ўзроўні нашай Расіі», — сказаў Прэзідэнт.

«Намеціўся сур'ёзны прагрэс у адносінах з ЗША і Еўрапейскім саюзам», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Пра ўклад Беларусі ва ўмацаванне міру і стабільнасці ў Еўропе

«У апошнія гады ўклад Беларусі ў забеспячэнне бяспекі, умацаванне міру і стабільнасці ў Еўропе атрымлівае ўсё большае міжнароднае прызнанне», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Сведчаннем таму з'яўляецца рашэнне правесці чарговую сесію Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Мінску. Такі маштабны міжнародны форум у Беларусі пройдзе ўпершыню, яго лозунг — «Умацаванне ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў імя міру і працвітання ў рэгіёне АБСЕ».

«На жаль, дабівацца гэтага сёння становіцца ўсё цяжэй. На зямным шары адзін за адным успыхваюць ачагі напружанасці. Тэрарызм з лёгкасцю пераступае межы і дасягае некалі самых шчаслівых краін. Сярод асобных дзяржаў трывала ўкаранілася імкненне вырашаць спрэчныя міжнародныя пытанні з дапамогай сілавых метадаў. Усё гэта вымушае нас усяляк умацоўваць абаронную моц Беларусі і развіваць ваенна-прамысловы комплекс, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Як вы разумееце, гэта не танна. І як бы нам ні было цяжка, не дай бог апошнія рубель і капейку аддаваць на снарады і зброю. Таму сёння, я разумею, няпроста, цяжка, але мы вымушаны займацца абаронай і бяспекай».

Пра абарону суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што калі ён як Прэзідэнт краіны і падначаленыя яму сілавыя структуры не забяспечаць прымальную грамадскую бяспеку і абарону, то незалежнасць і суверэнітэт краіны будуць асуджаныя. «Таму мы вымушаны надаваць вялікую ўвагу сілавому складніку», — сказаў ён.

«Трэцяга ліпеня ўдзельнікі і гледачы святочнага парада змогуць пераканацца, што нашы Узброеныя Сілы і ўзброены, і навучаны. Важна адзначыць, што гэты грозны арсенал быў мадэрнізаваны намаганнямі айчыннай навукі і канструктарскай думкі. Усё, што ў нас сёння на ўзбраенні ў арміі, — гэта наша: мадэрнізаваная, адноўленая і выведзеная на самы высокі ўзровень некалі савецкая тэхніка. Мы робім усё, каб наша армія стала яшчэ больш сучаснай і моцнай», — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што на роўных размаўляюць толькі з тымі дзяржавамі, якія здольныя за сябе пастаяць. «Гэта даказана нашай гісторыяй. Менавіта таму мы ўсімі сіламі будзем берагчы і абараняць суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць беларускай дзяржавы», — сказаў ён.

«Мір і стабільнасць дасягаюцца не па чараўніцтве. За гэтым — вялікія намаганні тых, для каго дарагая Айчына. Хто сваёй карпатлівай штодзённай працай умацоўвае яе магутнасць. Менавіта гэтым, а не хаджэннем па праспектах або пустой гаварыльняй на мітынгах дасягаюцца дабрабыт людзей і згода ў нашым агульным доме», — упэўнены беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў неабходнасць берагчы згуртаванасць грамадства і бяспеку краіны, усімі сіламі перашкаджаць любым праявам экстрэмізму і насілля. «Для гэтага ёсць толькі адзін шлях: настройваць сябе і сваіх дзяцей на стваральную працу і добра памятаць урокі гісторыі. Бо яна вучыць: здабыць суверэнітэт мала, трэба ўмець яго абараніць, адстаяць, зберагчы! Так, як абаранялі Радзіму нашы гераічныя продкі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пра моладзь

«Не трэба думаць, што, скончыўшы ў 20 гадоў ВНУ і нават добра скончыўшы, ты заўтра перасядзеш у «Мерседэс», і ўсё пасыплецца для цябе з нябёсаў. Нічога не пасыплецца! І кожны малады чалавек павінен разумець, што, уваходзячы ў гэтае жыццё, ён будзе знаходзіцца ў асяроддзі вельмі сур'ёзнай канкурэнцыі. І толькі тады будзе поспех, калі ты сваёй галавой, сваімі мазгамі і рукамі створыш сабе ўмовы для жыцця. Іншага не дадзена. І па гэтай прычыне не шукайце нічога ў свеце лепшага. Там, за мяжой, вам будзе яшчэ больш складана знайсці сваё жыццё. Не шукайце лёгкіх шляхоў у жыцці, іх не будзе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што сучаснае жыццё зусім іншае, яно стала больш інтэнсіўным, хуткім. «І нам яго не змяніць. Трэба прыстасавацца да гэтага жыцця. Трэба выстаяць і вытрымаць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Кожны з бацькоў жадае свайму дзіцяці шчасця. Ён стараецца даць яму самае добрае, навучыць усяму, што можа спатрэбіцца ў будучыні. Так і дзяржава — імкнецца вырасціць годнае маладое пакаленне. Ведайце: ваша Радзіма тут, менавіта на роднай зямлі вашы таленты могуць раскрыцца і прынесці сапраўднае натхненне для рэалізацыі ідэй і задум», — звярнуўся Прэзідэнт да прадстаўнікоў маладога пакалення.

«Якія б даброты вам ні абяцалі там, за мяжой, вы будзеце чужымі. Заўсёды памятайце пра гэта, як і пра слаўнае мінулае нашага народа», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Давайце ж усе разам, аб'яднаўшы сілы, умацоўваць гэты жыватворны край! Бо гэта наш лёс, сучаснасць і будучыня нашых дзяцей і ўнукаў!» — заклікаў Аляксандр Лукашэнка грамадзян.

Свята, якое з'ядноўвае

Урачысты мітынг, канцэрт і свята нацыянальнай культуры сталі галоўнымі падзеямі на Дзень Незалежнасці ў Магілёве.

— У жыцці кожнага народа ёсць лёсавызначальныя дні, якія становяцца пунктам адліку новага этапу яго гісторыі. Для нас важнай падзеяй стала вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у самай кровапралітнай вайне XX стагоддзя. Горад быў разбураны, але патрыятызм і гонар за сваю радзіму дазволілі адбудаваць Магілёў у самыя кароткія тэрміны. Працоўны і ратны подзвігі жыхароў Прыдняпроўскага краю былі адзначаны Ордэнам Леніна. Незалежнасць цяжка здабыць, але яшчэ цяжэй адстаяць і абараніць. У новых эканамічных умовах наша дзяржава даказвае сваю здольнасць забяспечыць стабільнасць развіцця, а беларускі народ праяўляе найлепшыя рысы нацыянальнага характару — уменне згуртавацца, выстаяць і перамагчы, — з гэтых урачыстых слоў **старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзіміра ДАМАНЕЎСКАГА** на святым для кожнага беларуса Буйніцкім полі пачалося ў Магілёве святкаванне Дня Незалежнасці.

Ушанаваць памяць загінулых і аддаць даніну павагі тым, хто вярнуўся дадому з той страшнай вайны, прыйшлі ветэраны, моладзь, прадстаўнікі працоўных калектываў, грамадскасці. Міхаілу Мікалаевічу Лошнецу, юнаму партызану Вялікай Айчыннай, ёсць пра што расказаць дзецям і падлеткам. Ён не аднойчы глядзеў смерці ў твар, але дажыў да Перамогі. «Для мяне вельмі важна ў найвялікшае для краіны свята прыйсці ў гэта святое месца, каб ушанаваць гераізм абаронцаў Айчыны», — кажа ветэран.

Да капліцы на Буйніцкім полі былі ўскладзены кветкі і вянкі ад кіраўніцтва вобласці, дэпутатаў, сілавых структур, грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў. Памяць тых, хто не вярнуўся з вайны, ушанавана хвілінай маўчання і трохкратным ружэйным стрэлам.

Губернатар уручыў Пасведчанні аб занясенні ў Кнігу Славы Магілёўшчыны найлепшым прадстаўнікам вобласці за ўклад у росквіт нашай краіны.

Для жыхароў і гасцей Магілёва 1—3 ліпеня было падрыхтавана шмат сюрпрызаў. На вуліцы Ленінскай і шматлікіх пляцоўках горада праходзілі святы сярэднявечнай культуры, хлеба, нацыянальных культур, а таксама — выстаўкі, спартыўныя спаборніцтвы... Каля тысячы чалавек удзельнічалі ў маштабным тэатралізаваным шэсці.

Святочны настрой у гэтыя пахмурныя дні падымалі на канцэртных пляцоўках зоркі беларускай і расійскай экстрады — Пётр Ялфімаў, Сасо Паўліяшвілі, Ларыса Доліна, Стас Касцюшкін, Вольга Кармухіна, Таццяна Аўсіенка, ансамбль «Лейся песня» і іншыя.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Гамяльчане Дзяніс і Вольга ГАПАНОВІЧЫ.

АРНАМЕНТ УЗДОЎЖ СОЖА

Традыцыйным беларускім узорам выкладзена тратуарная плітка ўздоўж знакамітага гомельскага парку. Урачыстае адкрыццё адбылося ў Дзень Незалежнасці.

Набярэжную ракі насамрэч рабілі ў некалькі этапаў, і вось сёлета была завершана рэканструкцыя пабудаванай яшчэ ў 1970-я гады паўночнай часткі — ад сажалкі з лебедзямі да рачнога порта. Літаральна за тры месяцы адрамантавалі паўтара кіламетра: зрабілі зручную пешаходную зону, лесвічныя сходы, пандус. Наберажная мае і пляцоўку для заняткаў скейтбордынгам.

На цэнтральнай плошчы гамяльчан і гасцей горада над Сожам парадавалі ўдзельнікі каманды пераможцаў XVIII рэспубліканскага агляду-конкурсу прафесійнага майстэрства супрацоўнікаў дарожна-патрульнай службы Дзяржаўтаінспекцыі МУС Рэспублікі Беларусь. Яны правялі паказальныя выступленні па хуткасным манеўраванні. Там жа прадставілі выстаўку спецыялізаванай тэхнікі.

Напярэдадні ў Гомелі на абласным урачыстым сходзе, прысвечаным Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, ушанавалі асоб, якім прысвоена званне «Чалавек года» Гомельскай вобласці. **Першы намеснік старшыні аблвыканкама Аляксандр МІКАЛУЦКІ** нагадаў, што больш як паўтара мільёна беларусаў ваявалі на франтах, тысячы людзей кавалі перамогу ў партызанскіх атрадах, у тыле.

У Дзень Незалежнасці ўсюды прайшлі ўрачыстасці з удзелам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і кіраўніцтва вобласці і горада, спартсменаў і творчай моладзі. Упершыню падчас шэсця па галоўнай вуліцы прыгожыя дзяўчаты пранеслі гербы дваццаці аднаго раённага цэнтра Гомельскай вобласці. На плошчы Працы каля Вечнага агню адбыўся мітынг. Менавіта там мы сустрэлі аднагадовага Дзяніса Гапановіча з матуляй Вольгай. Блакітнавокі хлопчык, адзеты ў ваенную форму, прыцягваў увагу, і з ім усе хацелі сфатаграфавацца. Матуля гаворыць, што касцюм яму спецыяльна заказалі і такім чынам зрабілі першы крок, каб выхоўваць дзіця патрыётам сваёй радзімы.

Дарэчы, **ветэран Вялікай Айчыннай вайны Казімір ДУШКЕВІЧ,** якому цяпер 91 год, падкрэсліў, што старэйшае пакаленне сёння ўдзячнае моладзі, якая працягвае традыцыі бацькоў і дзядоў:

— Мяне параніла пры фарсіраванні ракі Одэр у Германіі, і там вайна для мяне закончылася. Цяжка было адраджаць краіну, але, калі бачыш сённяшніх юнакоў і дзяўчат, разумееш, што ўсё, праз што мы прайшлі, было не дарэмна.

На стадыёне «Цэнтральны» гамяльчан павіншаваў са святам народны артыст Расійскай Федэрацыі Алег Газманаў. Ніводны раён Гомельшчыны не застаўся ўбаку ад святочных мерапрыемстваў. Парадавалі народныя гулянні з выстаўкамі і канцэртамі, гастранамічныя конкурсы, майстар-класы па пляценні з лазы, драўлянай скані, лепцы з гліны, выстаўкі-прэзентацыі дэкаратыўна-прыкладнай творчасці, фестывалі беларускай моды, шоу-праграма конна-спартыўнага клуба, вяслярная рэгата, тэатралізаваныя выступленні, акрабатычнае шоу і шмат чаго яшчэ. Апагеем стала традыцыйная народная акцыя «Праспяваем гімн разам!» і святочны салют.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

...І канцэрты духавога аркестра

Дзень Незалежнасці ў Брэсце пачаўся са свята аднаго з самых аддаленых мікрараёнаў горада — Бярозаўкі. У пятніцу вечарам на Бярозаўку прыехалі самадзейныя артысты. Канцэрты сабралі шмат людзей, святочны настрой хутка перадаўся жыхарам, якія з задавальненнем спявалі і танцавалі.

У суботу тон святкаванням задаваў улюбёнец брастаўчан — гарадскі аркестр духавой і эстрадная музыкі. Канцэрты прайшлі на вуліцы Савецкай і ў цэнтральным парку.

А 3 ліпеня зранку кіраўнікі гарвыканкама на чале са **старшынёй Аляксандрам РАГАЧУКОМ,** прадстаўнікі грамадскасці ўсклалі кветкі да помніка «Вызваленне» на плошчы Свабоды. І па даўняй традыцыі ў гэты ж дзень ушанавалі памяць герояў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны ў Брэсцкай крэпасці. Кветкі да Вечнага агню ўсклаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС.**

Тым часам па горадзе разварочваліся народныя гулянні. Парадаваў парк культуры і адпачынку па вуліцы Леніна. Акрамя традыцыйных атракцыёнаў, канцэртаў, кірмашу «Горад майстроў», тут прайшла прэзентацыя рэгіянальных брэндаў. Тыя, хто ні разу не быў на фэстах «Агурок-маладзец», «Лунінецкія клубніцы», «Мотальскія прысмакі», змаглі даведацца пра гэтыя святы. Пра рэгіянальныя фестывалі расказвалі фотавыстаўкі, самадзейныя артысты разыгралі сцэнкі з брэндавых фэстаў, тут жа можна было пачаставацца, напрыклад, мотальскай каўбасой. Гараджане прыходзілі сем'ямі, цікавіліся, забіралі з сабой буклеты.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

У падарунак — бальніца

У Мінскай вобласці ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню Незалежнасці, адбыліся на мемарыяльных комплексах «Хатынь» і «Курган Славы», на тэрыторыі гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна». Свята сабрала людзей таксама на вуліцах усіх райцэнтраў і горада Жодзіна.

Да Дня Рэспублікі ў Жодзіне адкрыты новы корпус бальніцы сястрынскага догляду, на праспекце Міру — алея ліхтароў. У Нясвіжы ўвялі ў эксплуатацыю новую гасцініцу, у Вілейцы ў гарадскім парку з'явілася бронзавая кампазіцыя «Маці і дзіця».

Святочны дзень быў напоўнены песнямі. Канцэрты прайшлі ва ўсіх райцэнтрах. Людзей забаўлялі самадзейныя творчыя калектывы, беларускія і расійскія зоркі эстрады: Аляксей Хлястоў, Алёна Апіна, гурт «СССР». А ў 22.45 на ўсю краіну прагучаў Гімн Беларусі, які падхапілі кіраўнікі вобласці, раёнаў, бізнесмены, журналісты і іншыя жыхары цэнтральнага рэгіёна.

Адначасова некаторыя гарады адзначылі і свае юбілеі. Напрыклад, Клецку споўнілася 890 гадоў. Святкаванні прайшлі адразу на чатырох пляцоўках.

Завяршылася свята феерверкам.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

КАШТОЎНАСЦІ, БЛІЗКІЯ ЎСІМ

На Віцебшчыне па добрай традыцыі святкаванню Дня Незалежнасці папярэднічае вельмі сімвалічная акцыя. На Кургане Дружбы на мяжы Беларусі (Верхнядзвінскі раён), Расіі і Латвіі праводзіцца сустрэча ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанаў і падпольшчыкаў. Сёлета яна адбылася 2 ліпеня — 58-ы раз. Курган быў афіцыйна адкрыты 3 ліпеня 1959 года.

У святкаванні бралі ўдзел губернатары Віцебскай і Пскоўскай абласцей, прадстаўнікі парламента і партый, грамадскіх арганізацый Латвіі. У 2018 годзе ў раёне Кургана запланавана правесці афіцыйную сустрэчу актывістаў маладзёжных саюзаў і аб'яднанняў памежных краін. Гэта стане дапаўненнем у традыцыю правядзення міжнароднай акцыі. Пра гэта паведаміў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ.** Ён падкрэсліў, што Курган Дружбы — сімвалічнае месца, яно нагадвае пра агульныя страты, перамогу, дасягненні ў пасляваенны час у калісьці адной для ўсіх краіне.

Тым часам у Лепелі адкрылі помнік воінам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. А на тэрыторыі былога шпіталя адбыўся мітынг, прысвечаны перапахаванню астанкаў разведчыкаў ГРУ Генеральнага штаба Чырвонай Арміі. Яны загінулі ў кастрычніку 1941 года ў ваколіцах вёскі Амосаўка.

З ліпеня ўжо ва ўсіх райцэнтрах і буйных населеных пунктах адбыліся святочныя мерапрыемствы. Эпіцэнтрам падзей у Віцебску стала плошча Перамогі. Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарстнёў, віншуючы землякоў, падкрэсліў, што галоўнае свята краіны сімвалізуе каштоўнасці, агульныя для ўсіх грамадзян.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

Фота Аляксея СПАТКАЯ.

НАГОДА ДЛЯ ГОНАРУ

У Гродна мерапрыемствы ў Дзень Рэспублікі распачаліся на плошчы Леніна. На пачатку ўрачыстасці адбылася цырымонія віншавання новых лаўрэатаў звання «Чалавек года Гродзеншчыны». Гэта 18 найлепшых прадстаўнікоў працоўных калектываў рэгіёна ў вытворчай, навуковай і культурнай сферах.

Пасведчанні лаўрэатаў уручыў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў. Губернатар адзначыў, што Дзень Незалежнасці — гэта яшчэ адна нагода падзякаваць тым, хто плённа працуе і ўносіць значны ўклад у развіццё краіны.

Па цэнтральнай магістралі горада прайшлі калоны ўсіх родаў войскаў, якія размешчаны на тэрыторыі вобласці. Па словах Уладзіміра Краўцова, заходняя рубяжы краіны пад надзейнай аховай вайскоўцаў. Пасля парада адбылася дэманстрацыя ўзораў ваеннай тэхнікі як старога, так і новага пакалення.

Дасягненні народнай гаспадаркі рэгіёна можна было ўбачыць на выстаўцы-прэзентацыі, прадстаўленай у зоне святочных мерапрыемстваў.

— Наша эканоміка сацыяльна арыентаваная і працуе на інтарэсы народа, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў. — Наша прадукцыя прадаецца амаль у 80 краінах свету. Высокія вынікі дасягаюцца высокаадукаванымі спецыялістамі, якія любяць сваю зямлю і ведаюць яе магчымасці.

Патэнцыял рэгіёна прадэманстравалі калоны прадстаўнікоў устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў Гродзеншчыны. Усе яны могуць пахваліцца дасягненнямі ў розных галінах эканомікі. Першымі прайшлі маленькія гродзенцы, а таксама маладыя пары, якія ўзялі шлюб у гэтыя святочныя дні.

Дарэчы, цэнтр горада быў падзелены на разнастайныя тэматычныя пляцоўкі і зоны — дзіцячыя, маладзёжныя, спартыўныя, прамысловыя. Цікавасць выклікала пляцоўка, дзе размясціўся жаночы хакейны клуб «Рытм» — гонар вобласці, пераможца Кубка Рэспублікі, які днямі завяршыўся ў Баранавічах.

Вуліца Савецкая ператварылася ў музычны брадвей. А на плошчы разгарнулася шматгадзінная святочная праграма «Беларусь — мой гонар і слава». Для наведвальнікаў былі створаны вельмі добрыя ўмовы. Каля сцэны да самага вечара працаваў рэстаран пад адкрытым небам.

Адноўлены Курган Славы сустрэў гродзенцаў і гасцей горада адвячоркам. Тут адбыўся канцэрт творчых калектываў і прафесійных выканаўцаў. Каля Кургана ўсе прысутныя разам заспявалі гімн краіны, пасля чаго неба над горадам успыхнула святочным салютам.

Маргарыта УШКЕВІЧ. *margo@zviazda.by*

■ Традыцыі і сучаснасць

СВЯТА МАЛАДОЕ!

У сталіцы другі раз прайшоў Дзень вышыванкі

Фота БЕЛТА.

У нашай краіне вышыванка з'яўляецца адным з нацыянальных сімвалаў. І калі яшчэ нядаўна арнамент часцей сустракаўся на нацыянальных касцюмах, то цяпер яго можна ўбачыць на майках, аўтамабілях і нават на татуіроўках беларусаў. Сёння вышыванка сапраўды ў модзе, што пацвярджае праведзены другі раз Дзень вышыванкі.

У нядзелю ў 12 гадзін дня на пляцоўцы побач з Палацам спорту было даволі шматлюдна. Напярэдадні святочнай праграмы ўжо працавалі крамы, дзе гандлявалі таварамі з нацыянальнымі арнаментамі, якія сёння выклікаюць немалую цікавасць у беларусаў. Напрыклад, **Вадзім МАКЕЙ** ужо больш за год займаецца продажам адзення і аксесуараў з беларускімі нацыянальнымі сімваламі. «Чаму на таварах з'явілася вышыванка? Таму што гэта блізка да нас, да нашай душы. Я раблю ўсё гэта не дзеля бізнесу, а дзеля ідэі, — адзначыў бізнесмен. — Для мяне вышыванка — гэта беларуская аўтэнтычнасць, карані, якія сыходзяць у самы пачатак нашага народа, культуры. Самае галоўнае — трэба разумець, што мы з'явіліся не пасля развалу Савецкага Саюза. У нас вельмі глыбокая гісторыя, якой мы павінны ганарыцца».

Сёння ўзоры арнаменту можна сустрэць не толькі на майках і кубках — некаторыя таварыя на свяце можна назваць сапраўды незвычайнымі. Напрыклад, у адной з імправізаваных крам прадавалася эксклюзіўная калекцыя ювелірных упрыгажэнняў. «Сёння гэтыя вырабы сапраўды вельмі папулярныя, — расказала **загадчыца сталічнага ювелірнага салона Анастасія МІРОНАВА.** — Але, на жаль, большай папулярнасцю такія ўпрыгажэнні карыстаюцца не ў беларусаў, а ў замежнікаў. Чаму так атрымалася? Жыхары замежных краін усё ж такі вязуць гэты тавар як сімволіку тых дзяржаў, у якіх яны пабывалі. А вышыванку адназначна можна назваць нашым сімвалам».

Немагчыма падлічыць усе нацыянальныя сімвалы, прадстаўленыя на свяце. Адным з такіх сімвалаў з'яўляюцца і ручнікі. «Мы іх больш не вырабляем, а толькі прадаём, — падзялілася **арганізатар Азёрскага цэнтра культуры Гродзенскага раёна Аляксандра КУЛІК.** — Чаму не робім новыя? На жаль, майстроў, якія маглі гэта зрабіць, ужо няма, а моладзь не надта рвецца займацца ручнікамі». Уменні і навыкі, якія здаўна перадаюцца з пакалення ў пакаленне, не павінны быць забытыя і страчаныя, упэўнена дзяўчына.

У адной з крам было вельмі шматлюдна: там прадаваліся лялькі, а таксама абярэгі. «Бачыце, якая папулярнасць, — яшчэ не паспелі як след расставіць тавары, а людзі ўжо набеглі, — усміхаецца **навуковы супрацоўнік Стрэнькаўскага цэнтра рамёстваў Рагачоўскага раёна Таццяна ЦЫРЫКАВА.** — Сапраўды, лялькі, абярэгі — усё гэта цесна звязана з беларускай гісторыяй. Ёсць розныя лялькі — сямейна-бытавыя, абрадавыя. Напрыклад, раней нашы бабулі рабілі абярэгі, каб абараніць сябе ад навальніцы ці іншай стыхіі».

Дарэчы, вельмі б спатрэбіўся ў Дзень вышыванкі абярэг ад дажджу. Непагадзь і невысокая тэмпература, напэўна, унеслі карэктывы ў планы многіх мінчан і гасцей сталіцы, бо не кожны захоча весяліцца і танцаваць у настолькі нялетняе надвор'е.

Урэшце, гэта не перашкодзіла правядзенню святочнай праграмы. У 13.30 праспект Пераможцаў уздоўж Палаца спорту ператварыўся ў імправізаваную плошчу, на якой прайшоў арт-парад «Пад сцягам з вышыванкай». Свае таленты гледачам прадэманстравалі творчыя калектывы, духавыя і інструментальныя аркестры, фальклорныя калектывы, танцавальныя школы, тэатры, прадстаўнікі розных прафесій і нацыянальных культур. Акрамя таго, свае ўменні паказалі джамперы, скейтбардысты, ролеры, брэйкеры, хадулісты, бітбоксеры, хіп-хопераы, мастакі бодзі-арт, аўтары бардаўскай песні, поп-, рок-гурты, прадстаўнікі рыцарскіх клубаў і байкеры...

— Праз усе стагоддзі наша жыццёвае разуменне праходзіла праз беларускі арнамент, які цалкам сімвалізаваў усе напрамкі жыцця ў Беларусі, адносіны да прыроды, блізкіх, продкаў, стаўленне да перамог і паражэнняў, — адзначыў на адкрыцці свята **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.** — І вельмі важна, што праз многія стагоддзі мы захавалі нацыянальны арнамент. Мы захавалі яго праз культуру і мастацтва, праз нашу дарагую вышыванку. І я ўпэўнены, што ў кожнага беларуса гэты арнамент ёсць у сэрцы.

— Мне здаецца, што гэта свята не толькі для БРСМ, але і для ўсіх нашых людзей. Гэта свята гонару, свята культуры і традыцый беларускага народа, — упэўнены **першы сакратар цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Андрэй БЕЛЯКОЎ.** — І гэта свята, якое аб'ядноўвае абсалютна ўсіх — тых, хто пражывае не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і за межамі нашай краіны. Хочацца, каб у такія дні беларусы ўспаміналі нашу культуру, нашы традыцыі і гісторыю. Хочацца, каб вышыванка аб'ядноўвала і засцерагала нас і надалей.

Падчас Дня вышыванкі адбылося дэфіле мадэляў «Вянок прыгажосці» ў касцюмах ад беларускіх дызайнераў і вытворцаў, унікальны гістарычны квэст «Мая Беларусь», спаборніцтвы па розных відах спорту «Алімп» і многія іншыя мерапрыемствы. Вядома ж, не абышлося без музычнага суправаджэння, якое арганізавалі ансамбль «Песняры», заслужаныя артысткі Рэспублікі Беларусь Ірына Дарафеева, Іна Афанасьева, Вікторыя Алешка, гурты «Аўра», «Дразды», «Правакацыя» і іншыя. Асабліва цёпла госці свята сустрэлі групу Naviband, якая зусім нядаўна прадстаўляла Беларусь на Еўрабачанні.

— Мы з першай нашай песні спяваем на беларускай мове, — нагадаў **вакаліст Naviband Арцём ЛУК'ЯНЕНКА.** — Мы адчуваем сваю місію: не толькі спяваць, але яшчэ і быць прыкладам для моладзі. Так, у нас ёсць вышыванкі, і мы выкарыстоўваем іх на нашых канцэртах, бо вельмі любім і паважаем сваю гісторыю.

Свята завяршылася традыцыйнай дыскатэкай і бітвай беларускіх дыджэяў. Нягледзячы на не вельмі спрыяльнае надвор'е, на Дні вышыванкі было сапраўды ўтульна — людзі змаглі стварыць атмасферу весялосці і цяпла.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

■ Гэта цікава

НАТХНЁНАЯ СІНЯВОКАЙ...

Дызайнер з Тайланда стварыла калекцыю адзення з беларускімі арнаментамі

Сёння ў нашай краіне нікога не здзівіць вышываная кашуля ці сукенка з традыцыйнымі беларускімі матывамі — вышыўкай, тканінай, фактурай. Хваля захаплення этнічным тут ператварылася ў сапраўдны модны трэнд. Таму і навіна пра новую калекцыю, якая падае этніку ў не зусім звыклым ключы, спачатку не выклікае здзіўлення. Але ўсё змяняецца, калі даведваешся, што такія смелыя рашэнні ў выкарыстанні нашых традыцыйных колераў, матываў, асобных элементаў арнаменту характэрныя для рэчаў, створаных дызайнерам Сіці СІЦІРАД з Бангкока.

— Як вы маглі здагадацца, у Паўднёва-Усходняй Азіі пра Беларусь пачуеш нячаста, — расказвае Сіці. — Але дзякуючы сацыяльным сеткам у мяне ёсць сябры з вашай краіны. Час ад часу ў чаце яны апавядаюць пра Беларусь, дасылаюць сувеніры. Гэта дапамагло мне зразумець, што паміж беларускай, рускай, украінскай культурамі ёсць адрозненні. І гаворка не толькі пра мову, але і пра адметныя рысы.

Як кажуць, адметнасці лепш бачацца здалёк, таму і дызайнерскія рашэнні, прынятыя Сіці, падаюцца сапраўды нечаканымі. Прынамсі, для вока беларуса, звыклага мысліць, абапіраючыся на традыцыйныя ўяўленні пра арнамент і спосабы яго выкарыстання.

— Я мастачка-рамесніца ці, прынамсі, магу сябе так назваць, — тлумачыць дызайнер. — Мяне натхняе штодзённасць, а таксама цікавяць спосабы ўпісаць традыцыйныя матывы ў сучаснае жыццё. Напрыклад, не так даўно я набыла японскае кімано і ператварыла яго ў новае адзенне. Або для вырабу зімовых паліто выкарыстоўваю тайскі шоўк ці саматканую бавоўну. Калі мне падарылі кнігу, прысвечаную традыцыйным беларускім касцюмам і арнаментам, я была крыху здзіўленая. Тут пабачыла класічнае спалучэнне чырвонага і белага колераў, адрознае ад уяўлення пра «сінявокую Беларусь», што мела дагэтуль. Але падумалася: выдатна, калі людзі, якія жывуць у акружэнні прыгожых пейзажаў, носяць такое адзенне. Таму і сама пачала вывучаць матывы арнаментаў, некаторыя запазычыла.

Ці быў страх нешта зразумець няправільна, не зусім карэктна ўжыць вобраз ці асобны элемент?

— Мне сапраўды спадабалася працаваць з беларускімі матывамі, я пачувала сябе вольнай і не думаю, што ў нечым цалкам мела рацыю ці памылілася. Вядома, я адчуваю павагу да культуры і крыху баюся рэакцыі, бо не ведаю, што самі беларусы скажуць пра маю калекцыю. Ці будзе для іх яна ў цэлым выглядаць як натхнёная Беларуссю.

На пытанні, хто ж будзе насіць гэтыя рэчы і ці завяршыла яна работу над калекцыяй, Сіці адказвае:

— Мае работы заўсёды ў адзінкавым экзэмпляры, таму іх пакупнікі хутчэй — калекцыянеры мастацтва. Калекцыя ніколі не з'яўляецца адразу цалкам, таму магу з упэўненасцю сказаць, што яна будзе дапаўняцца новымі рэчамі. Мне ж яшчэ столькі хочацца зрабіць!



За творчасцю Сіці Сіцірад можна сачыць у яе блогу www.thehandmadediary.com. Дарэчы, з нядаўняга часу, дзякуючы беларускім сябрам дызайнера, ён займеў і беларускамоўную версію.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

■ Мы разам — Беларусь!

ЯК НАДОЎГА ЗАРАДЗІЦЬ БАТАРЭЙКУ...

...ведаюць школьнікі, якія сабраліся пад Рагачовам не толькі для таго, каб паспяваць песні каля вогнішча. Сёння на іх ускладзена сур'ёзная роля медыяцыі. Калі справяцца, дарослыя суседніх дзяржаў хутчэй прыйдуць да паразумення.

Турыстычныя палаткі дзіцячага лагера на беразе возера Добрае, што на Рагачоўшчыне, былі пастаўлены ўпершыню ў 1992 годзе. Гэта быў сумны год адразу пасля развалу былога магутнага Саюза. Тады ніхто не мог і марыць, што праз чвэрць стагоддзя міжнародны лагер міру і дружбы дзяцей і моладзі славянскіх народаў «Крынічка» стане выконваць ролю аб'яднання нашчадкаў тых, хто шкадуе аб страчаным адзінстве славянскіх народаў.

Каля вёскі Ходасавічы 300 удзельнікаў з Беларусі, Расіі і Украіны разбілі палатачны лагер і сёлета. Дарэчы, калі палічыць, атрымліваецца, за час існавання тут пабывала каля 7500 падлеткаў. Мікалай Ананенка прыехаў у міжнародны лагер чацвёрты раз. Юнак са Смаленска толькі закончыў школу і рыхтуецца паступаць у ВНУ на спецыяльнасць «гісторыя і права». Гаворыць, што вопыт суіснавання ў паходных умовах стварае асаблівую атмасферу, дзе няма месца непаразуменню:

— Штогод прыязджаю па новыя ўражанні. Мы тут сустрэлі знаёмых, якія былі ў мінулыя гады, і знайшлі новых. Розныя людзі прыязджаюць сюды з гарадоў Расіі, Беларусі і Украіны. Мне здаецца, гэта прыемны і важны вопыт стасункаў. Цікава ж размаўляць з людзьмі, якія маюць, магчыма, іншы светапогляд. Увогуле, карысна ведаць, якім чынам развіваюць іншыя людзі. Ну, а пакуль мы

пад гітару ўспомнілі ўвесь асноўны рэпертуар «Крынічкі».

Між тым тут ёсць свая топавая песня, напісаная групай «Жукі» яшчэ ў 1999 годзе. «Батарэйку» спявала іншае пакаленне юнакоў. Песню пра каханне, якое некалі заканчваецца, перажываюць і сённяшнія падлеткі. Вось і каля іншага беларускага вогнішча яна таксама гучала.

Насця Ксяндзова не першы год у лагеры. Школу закончыла, тэсты здала і прыехала адпачыць у лагер з самага блізкага гарадка — Рагачова:

— Тут вельмі цёплая атмасфера. Мы штогод знаходзім дзякуючы гэтаму лагеру новых сяброў. Потым падтрымліваем кантакты ў сацыяльных сетках. Асаблівыя стасункі ў нас склаліся з рабятамі з каманды горада Курска. Дружба славянскіх народаў — гэта вельмі важна для ўсіх.

Калі расіяне прадстаўлены сямю атрадамі, беларусы — сямнаццаццю, то ўкраінскіх хлопчыкаў і дзяўчатак у лагеры сёлета няшмат. Адзін атрад з васьмі школьнікаў і двое дарослых прыехалі з Навагруда-Валынскага Жытомірскай вобласці. Марыя Кальчанка таксама не навічок у гэтым лагеры. Дзяўчына прыехала трэці раз і разумее навошта:

— Пасля першага разу эмоцыі мяне перапаўнялі. Людзі вельмі адкрытыя і прыязна ставяцца да ўсіх. Зноў хочацца перажыць такія добрыя пачуцці. Хочацца знайсці новых сяброў, размоўнікаў, аднадумцаў. Мы рыхтаваліся да конкурсаў, якія тут будуць ладзіцца. Вучылі песні, танцы. У нас былі вясёлыя рэпетыцыі — мы прыдумвалі і потым змянялі ўсё, але ж спадзяюся, што вынік спадабаецца. Беларускую мову мы разумеем, але ж кніжкі чытаем і фільмы глядзім расійскія. А ў жыцці часцей размаўляем па-ўкраінску. Мы валодаем абедзвюма мовамі, і ніводная не перашкаджае. Наадварот, добра, калі можаш з большай колькасцю людзей знаходзіць агульную мову і разумець іх.

Кіраўнік расійскага атрада Ірына Радкевіч з Санкт-Пецярбурга ў міжнародным лагеры ўпершыню. Пакуль што прыстасоўваецца да абстаноўкі, але ж самае першае ўражанне ўжо склалася:

— За дзень агледзеліся. Вельмі гасцінныя тут людзі, якія адразу ж прыходзяць на дапамогу. Нас нават у Рагачоў звазілі. З украінцамі ўжо мелі стасункі. Усё нармальна, без праблем.

— Калі дзеці будуць сябраваць, то нешта зменіцца і ў стасунках дарослых людзей, — лічыць **старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Беларускага фонду міру Цімафей ГЛУШАКОЎ.** — Дзеці ўсё тут робяць самі: сякуць дровы, гатуюць ежу. Мы арганізоўваем дні нацыянальнай культуры, кухні, гумару... Ёсць дзень, калі на тэрыторыі лагера нельга знаходзіцца без маскараднага касцюма. Тут праходзяць спаборніцтвы паміж дарослымі і дзецьмі. Дзеці, калі ад'язджаюць, заўсёды просяць аб наступнай сустрэчы.

Змена зараз у самым разгары. Яшчэ ёсць час для правядзення фестываляў творчасці, спартыўных свят, інтэлектуальных конкурсаў і дня міру. Трэцяга ліпеня ўсе дзеці прынялі ўдзел у святочных мерапрыемствах, прысвечаных Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і святу 875-годдзя Рагачова. **Старшыня праўлення грамадскай арганізацыі «Беларускі фонд міру», дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Максім МІСЬКО** кажа, што вельмі важна, што медыяцыяй пачынаюць займацца дзеці:

— Гэты лагер вяртае нас у дзяцінства, і сапраўды хочацца ўспомніць тыя часіны, калі мы жылі больш сэрцам, а не розумам. Мы не ведалі дарослых праблем, і ў нас не было меж для стасункаў. Гэта якраз тое, што здзяйсняецца і тут. У нашай краіне, якая так многа цярпела, арганізавана пляцоўка для дзіцячай міратворчасці. Псіхолагі ведаюць, што дзецям важна адчуць эмоцыі, каб потым, праз пэўны час, яны спрацавалі як ідэі і далей рэалізоўваліся ў дзеяннях. У сэрцах падлеткаў, якія тут сабраліся, няма канфлікту і варожасці. Дзіцячая міратворчасць можа сыграць больш глабальную ролю ў рашэнні нейкіх канфліктных пытанняў, чым нават вялікая палітыка.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

■ Невядомыя старонкі гісторыі

НА МАНЕЎРЫ — У ЛАГЕР-КАЗКУ

Унікальная кніга аб вытоках беларускай арміі — «Палігон. Гісторыя Скобелеўскага ваеннага лагера» — пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда»

Калі запытацца ў многіх з нас, што такое Скобелеўскі лагер, наўрад ці выявіцца вялікая колькасць знаўцаў. І толькі бывалыя вайскоўцы скажуць пра Абуз-Лясноўскі палігон, дзе сёння ўдасканальвае баявое майстэрства беларуская армія. А між іншым за 125 гадоў існавання прызначэнне гэтага месца — як бы яно ні называлася — не змянілася.

Пачынаючы з канца XIX стагоддзя невялікае поле паміж Слонімам і Баранавічамі становіцца эпіцэнтрам баявой падрыхтоўкі. На манеўры ў Скобелеўскі лагер, названы ў гонар «белага генерала», прыбываюць вайскоўцы Рускай імператарскай арміі. У асноўным — ураджэнцы Беларусі.

Летні лагер Мінскага гарнізона, пабудаваны ў 1892 годзе, ніколі не закрываўся. З моманту яго ўтварэння ён належыў войскам царскай арміі. У гады Першай сусветнай тут размяшчаліся палігон і лагер для немцаў. У міжваенны перыяд, калі тэрыторыя знаходзілася пад Польшчай, — гэта польскі вайсковы палігон, які падчас Другой сусветнай вайны пераўтварыўся ў канцэнтрацыйна-працоўны лагер для савецкіх грамадзян. Пасля Вялікай Айчыннай вайны тут — палігон агульнасаюзнага значэння. Цяпер ён належыць нашай арміі.

— Скобелеўскі лагер уяўляў сабой рускі купецкі гарадок, — расказвае **вядомы калекцыянер, лаўрэат прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне» Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ.** — Нягледзячы на сваё ваеннае прызначэнне, ён вылучаўся нестандартнай, нават дзіўнай архітэктурай — нагадваў казачны піянерскі лагер.

Пераканацца ў гэтым можна, пагартаўшы кнігу «Палігон. Гісторыя Скобелеўскага ваеннага лагера», якая пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі ўжо выйшлі ў Выдавецкім доме «Звязда». Аўтарскі калектыў — калекцыянеры Уладзімір Ліхадзедаў і Уладзімір Пяфціеў, а таксама доктар царкоўнай гісторыі Гардзей Шчаглоў — прадставілі філакартычнае даследаванне, тэма якога дагэтуль не ўздымалася.

Фотаздымкі, змешчаныя ў кнізе, не дадуць схлусіць. У дарэвалюцыйны час Скобелеўскі лагер уяўляў сабой не проста палігон для манеўраў і вучэнняў, гэта быў жылы лагер са складанай інфраструктурай. Акрамя відаў самога палігона, на фотаздымках — шыкоўныя будынкі афіцэрскіх сходаў, манеўры, стрэльбы. Тут можна ўбачыць не толькі баявую падрыхтоўку войскаў Рускай арміі, а і тое, як узнагароджвалі найлепшых вайскоўцаў, як быў наладжаны іх побыт, якім чынам афіцэры і салдаты бавілі вольны час. Адным словам, гэта не было замкнёнае жыццё ваеннага гарнізона — тут знаходзіліся цэлыя вуліцы, вельмі прыгожыя асабнякі афіцэрскіх сходаў, стаяла царква, у якой у тым ліку маліліся жыхары навакольных вёсак.

З архіўных даных вядома, што пазней на тэрыторыі лагера была пабудавана яшчэ адна царква — ранейшая, відаць, не ўмяшчала такой колькасці вернікаў. Але фотаздымкаў, якія пацвярджаюць гэты факт, не захавалася. Даследчыкі мяркуюць, што перад акупацыяй мясцовасці немцамі ў Першую сусветную вайну прыхаджане царкву разабралі.

Фотаздымкі дапоўнены тэкставай інфармацыяй на рускай і англійскай мовах. Цікавыя звесткі ўзяты не толькі з архіваў, а і з тагачасных газет, у асноўным беларускіх, якія захоўваюцца ў калекцыі Уладзіміра Пяфціева. Напрыклад, у адной з газет змешчана скарга на баранавіцкага ўрача, які першым у горадзе набыў уласны аўтамабіль, чым, вядома, вельмі ганарыўся. Але была ў яго і іншая загана — ліхачыў добра, у тым ліку і па вуліцах Скобелеўскага лагера. І ніяк на яго не маглі знайсці ўправы, пакуль аднойчы аўтамабіліст не напалохаў жонку і дачку знатнага генерала. Пасля гэтага выпадку стаў сачыць за хуткасцю.

Скобелеўскім лагер называўся не выпадкова. Быў час, калі Мінскім гарнізонам, на балансе якога і знаходзіўся лагер, камандаваў генерал Міхаіл Скобелеў. Выдатны рускі военачальнік XIX стагоддзя праславіўся падчас Руска-турэцкай вайны 1877—1878 гадоў. За любоў да белых кіцеляў і коней увайшоў у гісторыю як «белы генерал».

Напрыклад, у адной з газет змешчана скарга на баранавіцкага ўрача, які першым у горадзе набыў уласны аўтамабіль, чым, вядома, вельмі ганарыўся.

Кніга, прысвечаная гісторыі Скобелеўскага лагера, не першы праект аўтарскага калектыву. Уладзімір Ліхадзедаў, Уладзімір Пяфціеў і Гардзей Шчаглоў у такім жа фармаце ўжо паспелі расказаць пра падзеі 1812 года, пра лёс князя Уладзіміра.

— Ужо другое дзесяцігоддзе адліваем праект «У пошуках страчанага», які вырас на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня», — адзначыў **намеснік міністра інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** — Вялізны ілюстрацыйны масіў з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава ператварыўся ўжо ў некалькі філакартычных кніг, звязаных з гісторыяй Першай сусветнай вайны.

Тым не менш Уладзіміру Ліхадзедаву яшчэ ёсць пра што расказаць. Цяпер ён працуе над тэмай, звязанай з помнікамі, якія ў розныя часы былі пастаўлены ў Беларусі. Пра што канкрэтна даведаецца зацікаўлены чытач — пакуль інтрыга.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by
Фота Надзеі БУЖАН і з калекцыі Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА

■ Мінскія хронікі

ГІГАНЦКІ ПАРК І «КЛЮБЫ» ПА ІНТАРЭСАХ

Воблік сталіцы ў міжваенны перыяд

У 1920—1930-я гады Мінск перажываў сур'ёзныя змены. Губернскі горад станавіўся адміністрацыйным цэнтрам маладой рэспублікі. Якраз тады пачалі думаць аб рэканструкцыі горада, узводзіць будынкі ў нязвыклым канструктывісцкім стылі, па-новаму арганізоўваць вольны час...

Захаваць нельга зносіць

— У сувязі з павелічэннем насельніцтва Мінска ў гэты перыяд у горадзе паўстаў шэраг праблем. Па-першае, банальна не хапала будынкаў. У асноўным забудова была нізкапавярховай і шматлікія новыя ўстановы і арганізацыі не было дзе размясціць. Па-другое, пачаліся цяжкасці з транспартам, — расказаў **краязнаўца Павел РАСТОЎЦАЎ.**

Першыя намёткі генплана Мінска былі зроблены ў 1926 годзе, праўда, потым уся работа была разбіта ў пух і прах. Бо ў спецыялістаў адсутнічала геаздымка горада і не было абгрунтаванняў для тэкставай часткі.

У гэты ж перыяд пачалася глабальная рэканструкцыя Масквы: шырокія вуліцы, «парадныя дамы» і нават перанос будынкаў. Прадумаў план архітэктар Кагановіч, аўтарытэт якога ў той час быў настолькі высокі, што ў праектных дакументах па ўсім Саюзе пасля цытат Леніна і Сталіна абавязкова ішлі яго выказванні. Падобныя з маскоўскімі працэсы распаўсюдзіліся на сталіцы ўсіх савецкіх рэспублік.

Паколькі ў Мінску не было добрай праектнай школы, ужо ў 1930-я гады працаваць над новым планам прыехалі прадстаўнікі Ленгенпрагара. Наталля Макляцова, якая потым засталася ў беларускай сталіцы, спачатку адзначала, што трапіла ў досыць правінцыйны горад, у якім было ўсяго некалькі цікавых будынкаў.

Работа архітэктараў пад кіраўніцтвам прафесара Вітмана ў 1931 годзе таксама прайшла марна. Таму што ўсё яшчэ не было тапаграфічнай здымкі, геалагічнай прапрацоўкі мясцовасці, ніхто нічога не ведаў пра глебы горада і раянаванне. Працаваць над геадэзічнай здымкай пачалі толькі ў 1934 годзе, праўда, зробленая яна была якасна. На картах былі бачныя ўсе даваенныя дамы ў маштабе 1: 2000, гэта значыць у адным сантыметры — 200 метраў, што тады лічылася вельмі падрабязнай схемай.

У 1935 годзе Мінгарсавету было прапанавана сур'ёзна разгледзець пытанне раяніравання месцаў для жылля, прамысловасці і культурна-паркавых зон. Сярод галоўных праблем фігуравалі затапленне тэрыторый каля Свіслачы і чыгунка, якая псавала аблічча горада. Узвядзенне кожнага новага будынка ўспрымалася праз прызму: а ці зможам мы гэта зрабіць? Не хапала матэрыялаў, часцяком тое ж дахавае жалеза здымалі са старых пабудоў.

У новым плане, які ствараўся на аснове геаздымкі, велізарны раздзел быў прысвечаны прамысловасці. Ужо разглядаўся варыянт будаўніцтва гадзінніка-вага завода, вытворчасць лічылася не шкоднай, таму будаваць яго збіраліся недалёка ад парка культуры і адпачынку ў раёне Старажоўкі, хоць у выніку ён аказаўся каля іншага парка.

Клуб металістаў Мінску.

Метал і гума на тэрыторыі БССР не выраблялі, таму аб узвядзенні гігантаў не было гаворкі. Мінск павінен быў стаць цэнтрам мясцовай вытворчасці. У аснове — абутковая, тэкстыльная і харчовая прамысловасць. Меркавалася, што ў 1955 годзе колькасць жыхароў дасягне 500 тысяч, сетка вуліц пойдзе на поўнач у бок Лагойскага тракта, дзе больш чыстыя землі.

— Многія не прымаюць гэтую рэдакцыю плана, бо ён «пахаваў» гістарычны цэнтр горада. Але трэба разумець, што гэта было зроблена не толькі з-за таго, што ленінградская група крытыкавала Мінск за месцачковасць, але таму што Стары горад пастаянна затапляўся і будынкі знаходзіліся ў жахлівым санітарным стане. Магчымасці пракласці каналізацыю і водаправод без пашкоджання будынкаў не было. На гэтым месцы хацелі ўладкаваць вялізную зялёную паркавую зону. Паркавая магістраль павінна была ісці на поўнач праз Татарскія агароды ў раён цяперашняга Камсамольскага возера, якога тады не было і ў задумцы. А вось цэнтральныя вуліцы мусілі застацца вузкімі: шкадавалі каштоўную мураваную і цагляную забудову. Каб вырашыць пытанні з транспартам, планавалі зрабіць дзве кальцавыя дарогі, амаль там, дзе яны размяшчаюцца і зараз, — расказаў Павел Растоўцаў.

У 1938 годзе пачалі гаварыць аб магчымым пераносе сталіцы ў Магілеў, таму была прынятая больш «сціплая» рэдакцыя плана, разлічаная на значна меншы прырост насельніцтва. На паўднёвым усходзе горада планаваўся прамысловы кластар, параіўшыся з чыгуначнікамі, усё ж вырашылі будаваць абводную ветку чыгункі. Да 1940 года сітуацыя зноў памянялася. У новым плане ўжо ўзнікла парадная забудова цяперашняга праспекта Незалежнасці, галоўная набярэжная вяла да Круглай плошчы, якой, дарэчы, збіраліся даць імя Маякоўскага. А вуліца Захарава павінна была стаць вуліцай Маякоўскага, там жа ўзводзілі капітальныя будынкі з каланадамі, якія не захаваліся, і пракладалі трамвайную магістраль у раён цяперашняга трактарнага завода. Пасля вайны менавіта апошні праект і лёг у аснову генплана горада.

«Перамога» ў спадчыну ад харчавікоў

— Што датычыцца стылістыкі, то з пачатку 1920-х у Савецкім Саюзе панаваў канструктывізм, на змену якому больш як праз дзесяцігоддзе прыйшоў неакласіцызм, — адзначыў **гісторык Уладзімір САДОЎСКІ.**

Актыўна ў 20-я гады вялося клубнае будаўніцтва. Фарміраваўся новы быт, лічылася, што пасля завода пралетарый пойдзе ў клуб, ці кажучы на манер таго часу — клюб. Адзін з прыкладаў — Мінскі клуб металістаў. Прызначаўся для супрацоўнікаў металаапрацоўчых прадпрыемстваў горада і размяшчаўся на Універсітэцкай вуліцы, цяперашняй Кірава. Раней яна так называлася, таму што на ёй знаходзіліся некаторыя карпусы БДУ і некалькі іншых універсітэтаў, напрыклад, імя Леніна. Будынак клуба тыповы: дакладна такі ж быў узведзены ў Віцебску на беразе Дзвіны, прычым для тых жа самых мэт. У адрозненне ад мінскага ён захаваўся.

Яшчэ адзін прыклад такой архітэктуры — Клуб харчавікоў, які потым быў перайменаваны ў гонар Сталіна. Гэта не зусім страчаны будынак, на яго месцы з выкарыстаннем часткі канструкцыі быў пабудаваны кінатэатр «Перамога». Корпус, дзе месціцца зала для гледачоў, захаваўся, а галоўны фасад цалкам змяніўся. Будынак лічыўся прагрэсіўным, бо ў ім мелася некалькі вялікіх залаў, у якіх можна было мяняць планіроўку. Меркавалася, што дахі таксама могуць стаць пляцоўкамі для адпачынку, але насамрэч так яны ніколі не выкарыстоўваліся, таму потым былі заменены на паўнавартасныя паверхі. Менавіта тут упершыню ў Мінску адбываўся міжнародны чэмпіянат па грэка-рымскай барацьбе. Будынак пацярпеў ад бамбардзіровак у канцы вайны, потым быў адноўлены ўжо ў выглядзе кінатэатра.

Першая мінская АТС.

Адным з першых прадпрыемстваў сучаснага Мінска была малочная фабрыка або, як яе тады называлі, Цэнтральная малочня на вуліцы Маскоўскай. У 30-я гады ёй прысвячалі шмат артыкулаў, бо тут выраблялі 11 тысяч тон малочных прадуктаў у суткі, больш не маглі — не хапала сыравіны. На фабрыцы ўпершыню была арганізавана механізаваная мойка бутэлек, да гэтага малако прадавалася з металічных бідонаў, што садзейнічала распаўсюджванню захворванняў. У 1970-я гады малочны завод быў рэканструяваны і стары будынак знесены. Памяць аб ім захавалася ў назве суседняга завулка — Малочны.

У Шэрагу галоўных будоўляў міжваеннага Мінска быў універсітэцкі гарадок. Планы былі ўнушальныя, пышныя пректы прапаноўвалі на ўсесаюзным архітэктурным конкурсе. У 1920-я гады было пабудавана сем карпусоў, з іх да нас дайшло чатыры: напрыклад, геафак і стары педфак, які знаходзіцца ва ўнутраным дворыку сучаснага Педагагічнага ўніверсітэта. А вось на месцы старога хімфака зараз пустая пляцоўка, хоць ён і быў знесены дзясяткі гадоў таму дзеля новага будаўніцтва.

У той перыяд Мінск ганарыўся сваёй аўтаматычнай тэлефоннай станцыі, даволі сучаснай, нават на ўсесаюзным узроўні, якая была пабудавана на вуліцы Карла Маркса. Станцыя магла абслугоўваць да пяці тысяч абанентаў. А з эстэтычнага пункту гледжання вылучалася кантора Дзяржбанка СССР, пабудаваная з рысамі канструктывізму і рацыяналізму, які панаваў у заходнім свеце.

Што да жылых дамоў, то іх часта будавалі жыллёвыя таварыствы. Радавалі вочы мінчан дом «Асветнік-камунар» на Свярдлоўскай вуліцы, дзе жылі пісьменнікі і навукоўцы, у тым ліку і Кузьма Чорны, і дом спецыялістаў у раёне вуліцы Казлова, спраектаваны Наталляй Макляцовай. Ён быў адным з самых высокіх будынкаў у горадзе — 6 паверхаў, таму ў ім нават працаваў ліфт. Абодва дамы ў гады вайны былі разбомбленыя, аднак дом спецыялістаў потым пабудавалі нанова.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

«Да сваіх беларусаў і ў вёсцы зайду...»

Яшчэ летась «звяздоўская» пошта прынесла вось гэты верш... Спярша — у падрадковым перакладзе з удмурцкай на рускую мову. Газета звярнулася да лаўрэата дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міколы Мятліцкага з просьбай перакласці твор на нашу родную мову.

Да Мікалая Міхайлавіча звярнуліся не выпадкова. Ён і раней перакладаў Вячаслава Ар-Сяргі, які ў 2008 годзе прыязджаў у Беларусь на традыцыйны міжнародны круглы стол айчынных і замежных пісьменнікаў «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго», прымаў удзел у святкаванні Дня беларускага пісьменства. Вершы Вячаслава Ар-Сяргі друкаваліся ў «Полымі». А па-руску — у часопісе «Всемирная литература». Тады ж, у 2008 годзе, Вячаслаў Васілевіч перазнаёміўся са многімі беларускімі літаратарамі, шмат з кім пасябраваў... Зараз, калі часам піша па электронцы, згадвае светлай памяці паэта Юрыя Міхайлавіча Сапажкова. Нейкае душэўнае, сардэчнае яднанне атрымалася ў Вячаслава з беларускім паэтам Віктарам Гардзеем. Яны, як памятаю, не толькі пра Беларусь і літаратуру гутарылі, але і пра Віктару Гардзею знаёмую Каму. Так спакваля ў Віктара Канстанцінавіча шлях скіраваўся да перакладу кнігі вершаў удмурцкага паэта, і летась Выдавецкі дом «Звязда» кнігай Вячаслава Ар-Сяргі «Ранішні вецер у акне» адкрыў серыю «Сябрына: паэзія народаў Расіі».

У тую амаль дзесяцігадовай даўнасці паездку па Міншчыне наш удмурцкі сябра пабываў у вёсках Мётча Барысаўскага, Блужа, Блонь, Зацітава Слабада, горадзе Мар'іна Горка Пухавіцкага, гарадскім пасёлку Смілавічы Чэрвеньскага раёнаў, у самім Чэрвені. З вялікай цікавасцю ў Блужы ў школьным музеі распытваў пра Героя Савецкага Саюза воіна-«афганца» Мікалая Чэпіка. Была ў гэтых роспытах асаблівая нагода... У сярэдзіне 1980-х Вячаслаў служыў у войску у Туркестанскай акрузе, дакладней — у Ашхабадзе, з многімі беларусамі поруч. А дывізія, куды камсамольцаў Іжэўска і іншых удмурцкіх ваколіц накіроўвалі, была адмысловая — у ёй рыхтавалі папаўненне для савецкага кантынгента ў Афганістане...

З тае паездкі па Міншчыне нарадзілася некалькі беларускіх вершаў Ар-Сяргі — «У Камісарскім Садзе», «Зацітава Слабада»... Сёння яны вядомыя і беларускаму чытачу. Як і вось гэты пранікліві, шчыры твор, з якім зараз знаёмяцца чытачы «Звязды».

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

Вячаслаў АР-СЯРГІ,
народны пісьменнік Удмурціі

ВЕТРЫК — У БЕЛАРУСЬ

На Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь

Беларусь,
блаславёная Богам зямля,
Да цябе ветрам цёплым
лячу я здаля —
Да тваіх, Беларусь, гарадоў
Цеплынёю душы
я прыпасці гатоў...

Я праводжу сяброў у застолле,
Беларускую песню спяю...
Падару вам паклоны Прыкам'я,
А на памяць — і песню сваю!

Да сваіх беларусаў
і ў вёсцы зайду,
Там на танец
дзяўчыну-красу запрашу,
Да багатых сталоў
у гасціны прыйду —
Ціха-мірна ў куце пасяджу...

Беларускаю радасцю поўны, —
Прагучала як голас святынь...
Дзень для добрага ветру —
цудоўны,
Слёзы — у дождж, і — цяплынь...

3 ліпеня 2016 года

З удмурцкай.
Пераклаў Мікола МЯТЛІЦКІ.

Пантэон айчыны

ГЕДЗІМІН

(? — 1341)

Памяць пра Гедзіміна захавалася ў рэштках замкаў на Беларусі і ў Літве. Адзін з іх, Лідскі, або замак Гедзіміна, рэстаўраваны, цяпер ён мае першапачатковы выгляд і сімвалізуе той час — суровы і грубы. У Італіі пачыналася Адраджэнне, пісалі свае неўміручыя радкі Дантэ і Петрарка, а ў гэтым кутку Еўропы людзі думалі, як выжыць у полымі войнаў, як абараніць сваё права на жыццё. Замест храмаў будаваліся замкі, а ў агрубелых душах не было месца для прыгожага і мастацкага.

Ваяр і ўладар Гедзімін пайшоў далей за папярэднікаў у сваіх дзяржаўных здзяйсненнях. Пры ім вялася грандыёзная будоўля мураваных замкаў па лініі Трокі, Вільня, Меднікі, Гародня, Наваградак, Ліда, Крэва, Мядзел. Абапіраючыся на гэтыя замкі, Гедзімін хацеў даць адпор крыжакам. Патрэбна было намаганне ўсёй дзяржавы. Княжацкія слугі зганялі просты люд насыпаць валы, капаць ірвы, збіраць з палёў камяні і цягнуць іх на будоўлю. З тых часоў жывуць выразы: «Каб цябе закаталі ў Вільню горы капаць!» або «Каб ты на Крэўскі замак каменне цягаў!» Нялёгкае было будаўніцтва. Недахоп дойлідаў, майстроў і рамеснікаў Гедзімін кампенсаваў запрашэннем іх з Нямеччыны.

Новай сталіцай дзяржавы Гедзімін робіць былы Крывы — горад пад новай назвай Вільня, ад назвы рачулкі Вілейкі, што ўпадала тут у Вілію (па-беларуску Вяллю). Ужо ў 1323 годзе Вільня ў Гедзімінавых граматах называецца каралеўскім горадам. Лічыцца, што Гедзімін і заснаваў Вільню. У «Хроніцы Быхаўца» расказваецца, як падчас ловаў Гедзімін заснуў на Тур'яй гары і прысніў жалезнага ваўка, які выў, нібыта сто ваўкоў. Вяшчун растлумачыў ягоны сон: «Княжа, воўк вялікі жалезны азначае — горад сталічны тут будзе, а што ў ім унутры раве, дык слава яго будзе сягаць на ўвесь свет». Археолагі адабралі ў Гедзіміна славу заснавальніка Вільні. Яны ўстанавілі, што старажытнае гарадзішча Вільня пад назвай Крывы-горад існавала ўжо ў XI—XII стагоддзях. Пасяленне крывічоў знаходзілася і на левым, усходнім беразе Віліі. Пабудаваны Гедзімінам замак на Крывой гары абараняў гэтае пасяленне з Захаду. Узгорыстая мясцовасць вельмі аблягчала абарону горада. «З гэтага вынікае, што не сон пра жалезнага ваўка і не прадраканне чарнакніжніка далі Гедзіміну думку заснаваць тут сталіцу дзяржавы, але веданне вайсковай справы, прычым ён не мог не бачыць выгады размяшчэння. Гедзімін быў вялікі палкаводзец свайго часу і варты прыкладу, хоць ён і паганец», — пісаў ордэнскі пасол Кондрад Кібург.

Адзінае, у чым нельга з ім пагадзіцца, дык сцвярджэнне аб Гедзімінавым паганстве. Князь цытуе Евангелле, ведае Святое Пісанне. Магчыма, ён, як і яго ваяры, спавядаў ідэі ранняга хрысціянства-арыянства, што для хрысціянскіх іерархаў было страшнейшым за паганства. Менавіта ідэямі арыянства — павагі да чалавека як да боскага стварэння — і можна растлумачыць рэдкую верацярпімасць Гедзіміна. «Я не забараняю хрысціянам служыць Богу па іх звычаі. Русінам — па-свойму, а мы служым Богу па нашым звычаі, і ва ўсіх адзін Бог». Значыць, Гедзімін служыў таму ж Богу, што і хрысціяне, толькі па нашым звычаі. Для католікаў Гедзімін аднаўляе спалены крыжакамі касцёл у Наваградку і будуе новы ў Вільні. Ён падтрымлівае праваслаўную епархію ў сваёй дзяржаве. У нейкай ступені Гедзімін падняўся над рэлігіяй, для яго няма розніцы паміж русінам і літвінам ці жамойтам — усе яны ягоныя падданыя і роўныя перад ім. Пры Гедзіміне ВКЛ выросла амаль удвая. Гэты феномен гісторыкі тлумачылі «слабасцю заходнярускіх зямель» і нібыта незвычайнай моцай літоўскіх заваёўнікаў — тэорыя, якая цяпер не вытрымлівае не толькі сур'ёзнай крытыкі, але і простых пытанняў. Як маглі аслабець тыя ж Полацк, Віцебск, Смаленск, якія не былі завяваны татара-манголамі і дзейсна гандлявалі праз Рыгу з Ганзейскім саюзам? А гандаль — першасная крыніца даходу гэтых гарадоў. І як маглі ўзвысіцца спустошаныя крыжакамі літоўскія землі і іх князькі? Адкуль яны бралі гэтыя міфічныя сілы? З лясоў і пушчаў? Заслуга Гедзіміна была ў тым, што ён выступаў як прадстаўнік новай княжацкай дынастыі. Адбылася дынастычная рэвалюцыя, калі ад прадстаўнікоў старой дынастыі Рурыкавічаў, што канчаткова дэградавала і не змагла абараніць сваю краіну і народ і прыняла мангола-татарскае ярмо, проста па-

М. Андрыёлі. Сон Гедзіміна. 1882 г.

збавіліся. Ліцвінскія князі юрыдычна не падначальваліся Залатой Ардзе, а значыць і на іх уладанні яна не магла прэтэндаваць. Гэта было выратаванне.

Уладу Гедзіміна прызналі шэраг сталіц удзельных княстваў: Менск, Пінск, Тураў, Берасце. У Віцебску княжыў Гедзімінаў сын Альгерд, жанаты з дачкой апошняга віцебскага князя з русінскай дынастыі. Смаленскі князь прызнаваў Гедзіміна сваім «отцом» — уладаром. Такім чынам, амаль усе этнічныя беларускія землі былі сабраны ў адну дзяржаву, што і паспрыяла далейшаму фарміраванню народа, які называўся літвінамі, і толькі ў XX стагоддзі пачаў называцца беларусамі.

Гедзіміну ўдалося зрабіць тое, што да яго не змог зрабіць ні адзін старажытнабеларускі князь, нават славуты Усяслаў Чарадзей. У далучаных землях Гедзімін «старыны не рушыў і навіну не ўводзіў», г. зн. захаваў ранейшы ўклад жыцця.

З далучэннем «рускіх земляў» Гедзімін пачаў тытулавацца як кароль літвінаў і русінаў. У яго быў шанц ператварыць ВКЛ у моцную еўрапейскую краіну праз прыняцце каталіцтва. Аб сваім намеры Гедзімін паведаміў у 1322 годзе ў пасланнях да папы і нямецкіх гарадоў. Аднак з-за супрацьдзеяння паганскіх жрацоў і праваслаўных святароў, ордэнскіх інтрыг Гедзімін вымушаны быў адмовіцца ад свайго намеру. Ён цяжка перажываў гэтую няўдачу. Але ўсё ж не хацеў быць закладнікам гістарычных абставін. І пазней у больш спрыяльных умовах ён вярнуўся да свайго намеру. Каб не залежаць ад ордэнскіх ці польскіх святароў, Гедзімін запрасіў да сябе чэшскіх святароў і мноства хрысціян. «Свае ж, параіўшыся, князя атруцілі», — піша чэшскі летапісец Бенеш. А гэта перакрэслівае версію, што Гедзімін нібыта загінуў у 1341 годзе падчас штурму ордэнскага замка Баербург. Гедзімін зрабіўся ахвярай сваёй палітыкі, бо задумаў парушыць старыну і ўвесці навіну.

Як і яго слаўныя папярэднікі Тройдзень і Віцень, Гедзімін ваяваў з Тэўтонскім ордэнам і стрымліваў крыжацкі націск. 27 ліпеня 1320 года Гедзімін разбіў ушчэнт ордэнскае войска на чале з вялікім маршалам Генрыхам фон Плоцке. Аднак крыжакі па-ранейшаму нападалі на Жамойць і Літву, таму Гедзімін у 1325 годзе ахвотна пагадзіўся на саюз з польскім каралём Уладзіславам Лакеткам і нават аддаў сваю дачку Альдону за яго сына. Літвінскія дружыны Давыда Гарадзенскага і Альгерда Віцебскага ў 1326 годзе і 1327-м хадзілі ў паход на Брандэнбург. Падтрымліваў Гедзімін і Рыгу ў барацьбе з ордэнам. Абараняў Гедзімін у 1333-м і 1339 гадах ад маскоўскіх нападаў Смаленск, і, каб не заўчасная смерць, ён мог бы яшчэ шмат зрабіць — прынамсі праз хрышчэнне паганцаў з дапамогай папы ператварыць ВКЛ у каралеўства. І тады можна было пазбегнуць многіх бед і гістарычных пературбацый, не была б заключаная Крэўская ўнія, і гісторыя Літвы-Беларусі склалася б зусім інакш.

Вітаўт ЧАРОПКА.

■ Працяг тэмы

Музей гарадскога двара ці новая забудова?

ЯКІ ЛЁС ЧАКАЕ АСМАЛОЎКУ?

Днямі ў Адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска адбылася прэзентацыя праекта забудовы раёна Асмалоўкі. Аднак распачаць яе ўдалося не адразу. Актавая зала ўстановы была бітком набітая не толькі мясцовымі жыхарамі, але і грамадскімі актывістамі і журналістамі. Усе імкнуліся выказаць сваё меркаванне адносна лёсу забудовы ў цэнтры сталіцы.

На сённяшні дзень у раёне вуліц Старавіленскай, Кісялёва, Куйбышава, Камуністычнай (усё гэта і ёсць Асмалоўка) жыве 821 чалавек. Людзі займаюць 40 дамоў, ці 355 кватэр. Адзін з жыхароў пацікавіўся тэхнічным станам дома, у якім жыве, — ён зрабіў экспертызу за ўласныя грошы. Экспертыза выявіла, што яго дом знаходзіцца ў вельмі добрым стане.

— Я прапаную не быць галаслоўным і не вызначаць інтуітыўна, што стан гэтых дамоў дрэнны ці добры, — мяркуе **жыхар Асмалоўкі Віталь РАДОЎСКІ,** які прыйшоў на грамадскае абмеркаванне. — У мяне ёсць заключэнне, дзе гаворыцца пра тэхнічны стан бэлек, пра стан перакрыццяў на гарышчы, перакрыццяў паміж паверхамі, якія захаваліся выдатна, пражылі бамбёжкі 1941—1944 гадоў. Яны будаваліся нашымі дзядамі, нашымі бацькамі і сабраны з розных частак горада. Абгарэлая цэгла ўнутры пражыла вайну, на ёй сляды бамбёжкі, але мы наўмысна не сталі яе выдаляць — сляды вайны сведчаць пра гістарычнасць будынка. Нагадаем, што ў свой час заяўка на наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Асмалоўцы накіроўвалася ў Міністэрства культуры. Там прыняцце канчатковага рашэння адклалі на пэўны час: прапанавалі аўтарам заяўкі распрацаваць канцэпцыю магчымага «сэнсавага» напаўнення раёна. Таму пакуль што юрыдычна раён знаходзіцца пад аховай дзяржавы.

Грамадскае абмеркаванне праекта планавання тэрыторыі Асмалоўкі: у межах вуліц Старавіленскай, Кісялёва, Куйбышава, Камуністычнай.

Але ў галоўнага архітэктара праектаў «Мінскграда» Аляксандра Бандарчыка, адказнага за новы праект планавання Асмалоўкі, свой погляд на захаванне гэтых аб'ектаў: «Каб захаваць гэту забудову, улічваючы яе якасць, патрэбна яе знесці і пабудаваць тое ж самае, толькі з новых, сучасных матэрыялаў, — лічыць Аляксандр Бандарчык. — Гэта, натуральна, нерэнтабельна. Часта інвестар, які прыходзіць на пляцоўку, дзе мяркуецца знос, сам прапануе не зносіць, а часткова рэканструяваць будынак, які там стаіць. Таму цяпер мы пішам «Будынак падлягае зносу. Рашэнне пра знос прымае заказчык».

Адзін з камянёў спатыкнення ў гэтай гісторыі (з-за чаго чарговы раз здзіўляешся, навошта ўвогуле вядзецца дыскусія пра знос аднаго з самых прыгожых раёнаў сталіцы) — адсутнасць інвестара.

— На цяперашні момант інвестара няма. І з яго пошукам могуць узнікнуць вялікія складанасці. Бо працэнт мяркуемага зносу па гэтай тэрыторыі вельмі вялікі — каля 27%. З пункту гледжання бізнесу працэнт зносу больш за 15% лічыцца нерэнтабельным, — тлумачыць Бандарчык.

Спецыяліст удакладняе, якая мэта зробленага праекта. Ён устанаўлівае тэхнічныя абмежаванні для магчымых забудоўшчыкаў. Напрыклад, па высотнасці дамоў, якія маглі б тут паўстаць, — не больш за 9—12 паверхаў. Гэта значыць, 30-павярховы хмарачос дакладна не пабудуюць.

Прадстаўніца маладзёжнага аб'ядання «Гісторыка», якое выступала з прапановай надання Асмалоўцы статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, **Таццяна ПЯТРОВА** выказала меркаванне, што ў Асмалоўцы было б добра стварыць музей пад адкрытым небам:

— У нас узнікала ўжо шмат канцэпцый па развіцці гэтага раёна. Але тая, што нас найбольш зачапіла, — гэта гарадскі скансэн, музей мінскага двара. Плануецца адрадзіць традыцыю дваровых гульняў... З аднаго боку, людзі там жывуць і існуюць у сваёй прасторы. Але з іншага, яна насычаецца рознымі культурнымі з'явамі. Той, хто трапляе ў гэтыя кварталы, адчувае сябе ў іншым гарадскім мікракосмасе. Там шмат зеляніны, пануе спакойны, размераны побыт. На сёння Асмалоўка ўжо жыве сваім культурным жыццём. На год у ёй праходзіць каля 20 мерапрыемстваў рознай скіраванасці: гэта падобна, напрыклад, на фестывалі суседзяў у Адэсе. Чалавек, калі акунаецца ў гэту атмасферу гарадскога двара, дзе людзі жывуць па-суседску (а не мегаполіса, дзе ўсе чужыя), атрымлівае станоўчыя ўражанні. Да таго ж непадалёк знаходзіцца оперны тэатр. Асмалоўка якраз можа выконваць ролю таго месца, куды можна завітаць пасля спектакля, пашпацыраваць, зайсці ў кавярню.

Архітэктурнае бачанне Веранікі Мароз.

Спецыялісты адзінадушныя ў тым, што дамы, якімі можна ахвяраваць, — гэта толькі будынкі дзіцячых садкоў. Яны ўзводзіліся ў пазнейшы час, без асаблівай арыентацыі на ансамблевасць пасёлка: іх пабудавалі проста таму, што было вольнае месца. Па праекце архітэктара Сабалеўскага, на іх месцы можна ўзвесці тэрасныя жылыя дамы. Па праекце Веранікі Мароз, там можна пабудаваць шматфункцыянальны выставачны цэнтр. Частку дамоў, ашчадна адрэстаўраваўшы, прыстасаваць пад арт-рэзідэнцыі з майстэрнямі на мансардах. Навакольную тэрыторыю можна зрабіць пешаходнай, бо побач шмат аб'ектаў, якія таксама цікавыя турыстам.

Старшыня Цэнтральнага раёна сталіцы, у якім знаходзіцца Асмалоўка, **Ігар БУЗОЎСКІ** згодны, што розныя меркаванні маюць права на жыццё. Ён заклікаў усіх зацікаўленых (а найперш жыхароў гэтых дамоў) аб'ядноўвацца ў ініцыятыўныя групы. А сваіх прадстаўнікоў накіроўваць для работы ў камісіі, што будзе прымаць удзел у вырашэнні далейшага лёсу Асмалоўкі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*

■ Блакітнавокая

ВОСТРАЎ КАХАННЯ І ДЗЯВОЧЫХ СЛЁЗ

Пасля чарнобыльскай катастрофы самай чыстай у Беларусі, з экалагічнага пункту гледжання, з'яўляецца Віцебская вобласць. А самы чысты раён у ёй — Лепельскі. На шчасце, Лепельшчына — гэта край азёр. Блакітнай пярэстай картай яны раскінуліся па тэрыторыі ўсяго раёна. Карэспандэнт «Звязды» наведала два з іх — Шчыбат і Бобрыцу, — каб на свае вочы ўбачыць маляўнічасць мясцовай прыроды, каб на поўныя грудзі ўдыхнуць чысціню тамтэйшага паветра.

Калісьці Клімент Варашылаў, праязджаючы паміж гэтымі двума азёрамі, і звярнуў увагу на адметнасць мясцовасці. Было вырашана стварыць тут санаторый для аднаўлення здароўя байцоў Чырвонай Арміі. Падчас вайны ў ім размяшчаўся нямецкі шпіталь. Не зважаючы на тое, якой нацыянальнасці і поглядаў чалавек, прырода аказвала сваё лекавае ўздзеянне. Як вядома, адступаючы, ворагі часта імкнуцца знішчыць стратэгічна важныя аб'екты. Дык вось, пакідаючы санаторый, немцы захацелі ўшчэнт разбурыць яго. Здзейсніць задуманае ім не ўдалося дзякуючы мясцовым партызанам і падпольшчыкам.

У маі Лепельскі ваенны санаторый адсвяткаваў 71-годдзе. На сёння гэта адна з найлепшых лекавых устаноў у краіне.

Як злучыцца ім?..

Калі ўгледзецца ў далечыню над возерам Бобрыца (а яно досыць вялікае па памеры), можна ўбачыць там востраў. Ён называецца Востравам Кахання. Ёсць легенда, што аднойчы хлапец вырашыў пакатаць дзяўчыну на лодцы па возеры. Прывёз яе на востраў, паспрабаваў пацалаваць. Аднак дзяўчына не захацела цалавацца. Тады юнак пакінуў яе зусім адну. Небарака плакала ўсю ноч, ды так гучна, што было чуваць нават на беразе возера. Такая гісторыя кахання, крыху сумнага.

Ёсць і яшчэ адна ці то легенда, ці то быль, якая датычыцца саміх азёр. Кажуць, што тэрыторыя паміж імі — гэта водападзел. Хоць азёры Бобрыца і Шчыбат знаходзяцца на адлегласці прыблізна 200 метраў адно ад аднаго, яны не злучаюцца. Паміж сабой стасуюцца хіба што праз падземныя воды.

За трасай Мінск—Віцебск, за 300 метраў ад Бобрыцы і Шчыбата, размяшчаецца яшчэ адно возера — Лядна. Яно імкнецца да злучэння з гэтымі двума азёрамі.

Возера Бобрыца ўваходзіць у сістэму азёр, што злучаюцца пратокамі ў рацэ Уле і прытокам Заходняй Дзвіны. Гэта возера Некалач, што ўпадае ў Воласна, тое — у возера Мухна, Уклейна, уласна Бобрыца, Люкжына, Хоціна — і рака Ула.

Возера даўжынёй 8 кіламетраў

Азёры надзвычай чыстыя: водзяцца ўсе віды прэснаводных рыб, акрамя вугра. Адзін з самых вялікіх самоў, вылаўленых тут, важыў 32 кілаграмы. Водзяцца таксама шчупакі, акуні, плотка, краснапёрка, верхаводка, лінь, налім, ёрш. Сапраўдны рай для рыбака! Прычым ахвотных пастаяць на беразе з вудачкай тут шмат не толькі летам, але і ўзімку.

Адметна, што даўжыня возера Бобрына — 8 кіламетраў. Яго атачае хваёвы лес, месцамі сустракаюцца ліставыя дрэвы, шмат бяроз.

Паколькі інфраструктура тут надзвычай развітая, можна, напрыклад, доўга ехаць на веласіпедзе ці квадрацыкле па лясной сцежцы над абрывам, за якім паблісквaюць спакойныя воды Бобрыцы.

Тут шмат чарніц, грыбоў. Вясной усе берагі зэюць белымі вочкамі ландышаў.

Тыя, хто не засяліўся ў санаторый, могуць зняць жыллё ў вёсцы Бароўка (колішні пасёлак), што знаходзіцца непадалёк.

Варта адзначыць, што такі прыгожы доўгі пляж, як на беразе Бобрыцы, мала дзе заўважыш у Беларусі. Заўсёды раўнюткі, чысты пясок, вабныя шэзлонгі, каляровыя лаўкі, адкрытыя невялікія шатры, што засцерагаюць ад сонца. Тут можна гуляць у вялікі і настольны тэніс, бадмінтон, валейбол. Як ужо адзначалася, браць у арэнду веласіпеды і квадрацыклы. Натуральна, выгоды прадастаўляюцца найперш наведвальнікам санаторыя. Аднак і іншыя госці знойдуць месца і забаву па душы.

І ў нас стыхія сваволіць!

Вада ў азёрах не толькі чыстая, але яшчэ і мінералізаваная. Мясцовымі жыхарамі заўважана, што купанне ў азёрах спрыяе зажыўленню ран. Шмат крыніц, прыродных плыняў.

У бязветранае надвор'е часам нечакана можа наляцець з Паўднёвага Захаду шквальны вецер. Ён падымае хвалю вышынёй больш за паўметра. У такі час знаходзіцца ў возеры, асабліва катацца на лодцы, небяспечна. На мачце лодачнай станцыі падымаецца чырвоны сцяг — гэта значыць, плаваць на лодцы нельга. Калі на хвалях з'яўляюцца белыя пеністыя баранчыкі, трэба тэрмінова прычаліць да бліжэйшага берага. Пры магчымасці па мелкаводдзі прыплыць на водную станцыю. Заплываць у пратокі нельга з-за карчоў, якія могуць быць там, мелкаводдзя і багністых берагоў.

Існуе паміж трыма азёрамі (трэцяе возера — Лядна) і свой мікраклімат. Калі ў адным з суседніх населеных пунктаў ідзе дождж, то побач яго няма, і наадварот — такая цікавая заканамернасць.

Купаючыся ў мінеральнай вадзе

— Нашы азёры вельмі чыстыя, у параўнанні, напрыклад, з тымі, што пад Мінскам. Нават з Браслаўшчыны, краю блакітных азёр, часам прыязджаюць адпачываць да нас. Штомесячна мы здаём аналіз вады на лабараторныя даследаванні — і яна аказваецца надзвычай чыстай, — расказвае **намеснік начальніка па медыцынскай частцы Лепельскага ваеннага санаторыя Сяргей ГОЛУБЕЎ.** — Побач размяшчаюцца дзве свідравіны мінеральнай вады. Адна з іх, што здабываецца з глыбіні 300 метраў, выкарыстоўваецца для лячэння страўніка, хваробы абмену рэчываў, цукровага дыябету — яе наўпрост п'юць. А другая, што здабываецца з глыбіні 600 метраў, падыходзіць для прыняцця ваннаў і лечыць сардэчна-сасудзістыя захворванні, праблемы апорна-рухальнай, нервовай сістэм... Улічваючы існаванне такіх крыніц зусім побач, не выключана, што і ў возера трапляе мінералізаваная вада.

Клімат, ландшафт, дрэвы, мінеральныя воды, лекавыя гразі — усё гэта сапраўды дазваляе аднавіць жыццёвыя сілы чалавека.

Дарэчы, на беразе Шчыбата размяшчаецца дзіцячы рэабілітацыйны цэнтр «Жамчужына», дзе праходзяць аздараўленне дзеці, якія жывуць на тэрыторыі, забруджанай падчас чарнобыльскай катастрофы.

Хаткі на колах і электрастанцыі

— Здаём напракат катамараны і лодкі, мангалы і шампуры, кацялкі для юшкі, нават дровы прадаём, — расказвае **загадчык лодачнай станцыі Васіль КАПОШКА.** — Лодак у нас ажно 30, бо попыт ёсць. Тут шмат хто адпачывае — з Мінска, Віцебска, Чашнікаў, Піцера. Калі добрае надвор'е летам, поўна народу: 12 альтанак са сталікамі — усе запоўненыя. Для рыбакоў маем пяць адмысловых лодак-пласкадонак, яны больш устойлівыя. Самі канапацім, рамантуем іх, падтрымліваем у належным стане. Вакол лес, прырода, таму тры летнія месяцы ўсе берагі ў нас зазвычай запоўненыя. На супрацьлеглым ад нас беразе, куды заязджаюць ад вёскі Лядна, часта ўтвараецца цэлы палатачны гарадок. Адпачывальнікі прывозяць з сабой і ўласныя хаткі на колах, электрастанцыі, лямпачкі, магнітафоны, надзіманыя лодкі, сваіх сабак...

***

На прыгожы, добра абсталяваны пляж трапляеш праз кантрольна-прапускны пункт Лепельскага ваеннага санаторыя. Ніякіх пытанняў на ўваходзе не ўзнікае.

Блукаючы па чыстым, па-еўрапейску прыгожым беразе, думаеш: адразу бачна, што за справу тут узяліся вайскоўцы, якія ўмеюць усё даводзіць да ладу!

Хочацца больш такіх пляжаў у Беларусі. На тое мы і блакітнавокая краіна.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*
Лепельскі раён

■ Спорт-тайм

ЯШЧЭ АДНА «ЗАЛАТАЯ РЫБКА»

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра поспехі беларускіх плыўцоў на юніёрскім чэмпіянаце Еўропы, вынікі матчаў 15-га тура футбольнага чэмпіянату краіны і розыгрыш Кубка канфедэрацый, які завяршыўся ў Расіі.

1. ***Анастасія Шкурдай заваявала залатую ўзнагароду юніёрскага чэмпіянату Еўропы па плаванні, які завяршыўся ў Нетаніі.*** У сваёй кароннай дысцыпліне 50 м батэрфляем яна паказала час — 26,53 сек. Па выніках турніру беларускія спартсмены занялі 12-е месца ў агульнакамандным заліку і ўсталявалі шэсць юнацкіх рэкордаў Беларусі.

2. ***Штурхальніца ядра Юлія Леанцюк стала бронзавым прызёрам этапу «Брыльянтавай лігі» ў Парыжы.*** Беларуска паказала свой лепшы вынік у сезоне — 18 м 28 см. Алена Дубіцкая завяршыла выступленне на чацвёртым месцы — 18 м 23 см.

Нагадаем, галоўным стартам для беларускіх лёгкаатлетаў стане чэмпіянат свету, які з 4 па 13 жніўня прыме Лондан.

3. ***Згуляны матчы 15-га тура футбольнага чэмпіянату краіны.*** Мінскае «Дынама» пасля чатырох перамог запар саступіла на сваім полі «Віцебску» з лікам 1:3. Футбалісты жодзінскага «Тарпеда-БелАЗ» у Мазыры абыгралі гаспадароў — 3:0. Матч «Мінска» і «Крумкачоў» завяршыўся з лікам 0:0, такія ж лічбы на табло былі зафіксаваныя і ў гульні «Іслачы» з «Нафтанам». БАТЭ перамагло «Гарадзею» — 2:0, а брэсцкае «Дынама» «Гомель» — 3:0. «Слуцк» з мінімальнай перавагай быў мацнейшы за «Днепр» — 1:0. У заключным паядынку першага круга нацыянальнага першынства салігорскі «Шахцёр» сустрэўся з гродзенскім «Нёманам».

Становішча ў групе лідараў: «Шахцёр» — 35 ачкоў, БАТЭ — 33, «Дынама» (Мінск) — 31, «Слуцк» — 28.

4. ***Розыгрыш Кубка канфедэрацый завяршыўся перамогай зборнай Германіі, у фінале немцы былі мацнейшыя за чылійцаў 1:0.*** У гульні за 3-е месца футбалісты Партугаліі атрымалі валявую вікторыю над камандай Мексікі ў авертайме — 2:1.

Нагадаем, прызавы фонд Кубка канфедэрацый — 2017 размеркаваўся так: 1-е месца — $4,1 млн, 2-е — $3,6 млн, 3-е — $3 млн, 4-е — $2,5 млн. Зборныя, якія завяршылі турнір на групавой стадыі, заробілі па $1,7 млн.

5. ***Наша зборная па пляжным футболе трэці раз выйграла Кубак Дружбы, які завяршыўся ў Віцебску.*** У заключным паядынку беларусы перайгралі каманду Азербайджана з лікам 4:3. Да гэтага каманда разграміла літоўскіх «пляжнікаў» — 11:2 і з мінімальнай перавагай адолела сапернікаў з Турцыі — 2:1.

Для зборнай Беларусі гэта трэці трыумф у розыгрышы Кубка Дружбы, столькі ж разоў першае месца займала каманда Ірана, адзін раз першынствавалі ўкраінцы.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

■ Новыя імёны

Аліна ГАРНАСЬКО:

«Я была пухленькая і не падавала надзей»

За мастацкую гімнастыку сэрцы беларускіх балельшчыкаў заўсёды спакойныя. Вось ужо другое дзесяцігоддзе на змену адной таленавітай грацыі прыходзіць іншая, не менш перспектыўная і паспяховая. Нашы дзяўчаты вельмі рэдка вяртаюцца з міжнародных турніраў без узнагарод, а за іх гучнымі імёнамі, як правіла, стаіць моцная беларуская школа і мама ўсіх нашых мастачак — Ірына Ляпарская.

Пасля Алімпійскіх гульняў 2016 года тагачасны першы нумар зборнай Меліціна Станюта абвясціла аб завяршэнні кар'еры. «Я зрабіла ўсё, што ўмела, лепш не магу», — казала дзяўчына ў сваіх інтэрв'ю пасля Рыа. У камандзе заставалася маладая гімнастка, якая, тым не менш, ужо набралася вопыту, — Кацярына Галкіна. Менавіта на яе ўсклалі далейшыя надзеі. Але Кацю пачалі турбаваць траўмы, якія недзе вымусілі выступаць не ў поўную сілу, а недзе і зусім прапускаць турніры. У гэты час сваё слова сказала яшчэ больш юная беларуская грацыя — Аліна Гарнасько. Хтосьці можа памятаць гэтую дзяўчыну яшчэ па чэмпіянаце Еўропы ў Мінску ці юніёрскіх стартах, дзе выхаванка алімпійскай чэмпіёнкі Марыны Лобач не раз падымалася на п'едэстал гонару. А ў гэтым маі ўжо на дарослым першынстве кантынента нечакана для многіх, ды і перш за ўсё для сябе, Аліна заваявала бронзавы медаль у практыкаванні з мячом, а потым паўтарыла свае поспехі на этапах Кубка свету. Як гэта было і з чаго ўсё пачыналася, гімнастка расказала ў інтэрв'ю «Звяздзе».

«Пераглядаю першыя выступленні і думаю, як з мяне магло нешта атрымацца?..»

Для Аліны гэта адно з першых вялікіх інтэрв'ю, дзяўчына яшчэ не прывыкла да павышанай увагі прэсы, але, нягледзячы на хваляванне, яна вельмі разважлівая ў адказах. Аліна ўспомніла, як даваліся ёй першыя выступленні ў эліце сусветнай мастацкай гімнастыкі.

— Першы выезд з дарослай камандай быў на міжнародны турнір у Маскву, пасля паехала на Гран-пры ў Кіеў, дзе ўпершыню сам-насам сустрэлася з самымі моцнымі гімнасткамі планеты. Мякка скажам, тыя мае выступленні вымушалі жадаць лепшага, гэта я бачыла сама, пра гэта казалі і трэнеры. Псіхалагічна я, напэўна, сябе проста перагрузіла. Як маладой гімнастцы, мне трэба было проста выходзіць і рабіць, без усякага грузу адказнасці, які я на сябе ўзяла. Бо за межамі спаборніцкай пляцоўкі працавала нармальна, трэнер гэта ведае, а выходзіла на дыван і нічога не магла паказаць. У нейкі момант, мне здаецца, трэнеры ўжо не ведалі, што са мной рабіць.

«У нас, як і ў балеце, людзі бачаць усё толькі самае прыгожае».

Нягледзячы на першыя дарослыя няўдачы, турніры для Аліны працягнуліся Гран-пры і этапамі Кубка свету. Паступова напрацоўвалася стабільнасць, а пік формы прыпаў якраз на чэмпіянат Еўропы, дзе ў практыкаванні з мячом Аліна стала трэцяй.

— Гэта было вельмі нечакана. Пасля выступлення на табло паказалі вынік, на той момант было, напэўна, 2-е ці 3-е месца, але пасля мяне выступалі яшчэ многія, таму я нават не звярнула ўвагу. Пабегла пераапранацца на іншае выступленне. Зрабіла праграму з булавамі

Тры пакаленні беларускай мастацкай гімнастыкі: Марына ЛОБАЧ, Аліна ГАРНАСЬКО і Любоў ЧАРКАШЫНА.

і гляджу, нешта трэнеры занадта радасныя. Такім чынам, толькі перад выступленнем са стужкай даведалася пра свой медаль. Дарэчы, у булавах я страціла ўзнагароду, выканала практыкаванне чыста, але судзейства было, на мой погляд, занадта суб'ектыўным, маёй саперніцы паставілі ўсяго на 5 сотых больш.

Напярэдзе Аліны на чэмпіянаце Еўропы аказаліся толькі расіянкі, якія сёння з'яўляюцца лідарамі ў сусветнай мастацкай гімнастыцы — Аляксандра Салдатава і Арына Аверына.

— Калі толькі пачынала выступаць сярод найлепшых, можа быць, і глядзела на іх як на «зорак», а цяпер ужо наогул не адрываюся на гэтыя рэчы. Больш за тое, мы з дзяўчатамі пасябравалі, канкурэнцыя толькі на пляцоўцы.

Першы трэнер Аліны Гарнасько цяпер працуе са зборнай Францыі, ад яе ў 10 гадоў таленавітая гімнастка-пачатковец трапіла ў групу да алімпійскай чэмпіёнкі Марыны Лобач, якая і цяпер трэніруе дзяўчыну. Упершыню на вочы галоўнаму трэнеру зборнай, Ірыне Ляпарскай, Аліна трапіла ў 2013-м, адтуль і пачаўся яе ўдзел у юнацкіх і маладзёжных міжнародных турнірах.

— Я жыву за горадам, каля Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі «Стайкі», раней там працавала бабуля, а я заўсёды назірала за трэніроўкамі спартсменаў. Ды і сама, бацькі кажуць, выяўляла небывалую актыўнасць, таму ў 3 гады мяне прывялі ў мастацкую гімнастыку. Я была вельмі пухленькая і не падавала ніякіх надзей, цяпер, бывае, пераглядаю свае першыя выступленні і думаю, як з мяне магло нешта атрымацца?..

«Часта прадметы прылятаюць проста ў твар»

Трэніроўкі ў гімнастак нацыянальнай зборнай займаюць звычайна 8 гадзін у суткі, 6 дзён на тыдзень, адпачынак — усяго каля двух тыдняў. Але Аліна ведае, дзеля чаго робіць такую працу.

— Цяпер я займаюся ў задавальненне, бываюць складаныя, пераломныя моманты, калі ты ўжо нават не глядзіш на тое, які шлях прайшла, хочацца ўсё кінуць. Але думаць пра гэта буду потым, калі дасягну сваёй мэты.

«Чым старэйшай становішся, тым больш балюча і цяжка гнуцца».

Не палохаюць дзяўчыну і траўмы, давалі частыя ў мастацкай гімнастыцы.

— Часта прадметы прылятаюць проста ў твар, а наогул, галоўная праблема ў нас — гэта спіна, чым старэйшай становішся, тым больш балюча і цяжка гнуцца. Сцёгны баляць з-за расцяжкі, скачкоў, нагрузкі.

Цікаўлюся ў Аліны пра яе папулярнасць і вядомасць, а таксама пра тое, як яна ставіцца да «зорнай» хваробы. У сацыяльных сетках у дзяўчыны сёння ўжо больш за 12 тысяч падпісчыкаў.

— Спадзяюся, мяне гэта не закране, вельмі хутка акунаюся ў спаборніцтвы і забываю пра свае поспехі. Нагадваюць толькі журналісты або балельшчыкі. Нядаўна мяне пазналі ў адным з мінскіх кафэ, было вельмі нечакана. А наогул, калі казаць аб падтрымцы балельшчыкаў, то самая ашаламляльная яна ў Іспаніі. Нядаўна былі там на этапе Кубка свету, я яшчэ не настолькі вядомая, тым не менш убачыла велізарную колькасць плакатаў з маімі фотаздымкамі, было шмат віншаванняў, sms, відэа. Ні ў якой краіне свету больш такога не сустрэнеш. Мае прыхільнікі там ужо стварылі мноства фан-груп, старонак у сацыяльных сетках. Пішуць мне паведамленні на іспанскай, а некаторыя прымудраюцца з дапамогай інтэрнэту перакладаць іх на беларускую, гэта вельмі забаўна.

Выступаць пры вялікай поўнай зале было нязвыкла, трыбуны крычалі так, што я ледзь пачула пачатак сваёй музыкі, думаю, з-за гэтага магла дапусціць памылку ў фінале. Але ўсё роўна вельмі прыемна і зручна выступаць пры добрай падтрымцы. Хвалюючы заўсёды, але я кажу сабе, што трэба выйсці і проста зрабіць практыкаванне так, як ты рабіла гэта на прагоне некалькі хвілін таму.

Цяпер ужо Аліна сама становіцца для кагосьці кумірам, а для яе калісьці такімі людзьмі была яе трэнер Марына Лобач і Меліціна Станюта.

— Меліціна — вялікая малайчына, лёс склаўся так, што яна не атрымала алімпійскі медаль, і нічога з гэтым не зробіш. Яшчэ мне заўсёды падабалася расіянка Маргарыта Мамун, ну і, вядома, мой трэнер Марына Вікенцьеўна. Яна заўсёды дае мне парады, падказкі, перадае свой вопыт, які вельмі дапамагае.

«Колькі сіл, поту і слёз было ў зале, застаецца за кадрам»

У мастацкай гімнастыцы не прынята вылучаць любімы прадмет, а вось пра тое, з якім, працаваць складаней за ўсё, Аліна сказаць можа.

— Пакуль прадмет, які ў мяне адстае, — гэта стужка, ні на адным турніры я не зрабіла яе без памылак, таму трэнірую гэта практыкаванне нашмат больш за астатнія. Тут яшчэ такая справа: паводзіны стужкі залежаць ад навакольнага асяроддзя — спёкі, вільготнасці, кандыцыянераў. Кожная гімнастка прыдумляе для сябе нейкія хітрыкі — хтосьці гладзіць стужку прасам, хтосьці мочыць вадой, выкарыстоўвае тальк або лак.

Часта мастацкую гімнастыку называюць сумессю спорту і мастацтва, тут сапраўды важныя ўсе кампаненты: кампазіцыя, музыка, касцюм, вобраз і, вядома, сам знешні выгляд спартсменкі.

— У нас, як і ў балеце, людзі бачаць усё толькі самае прыгожае — лёгкасць, прыгажосць, грацыю, а колькі сіл, поту і слёз было ў зале, застаецца за кадрам. На самай справе за выступленнем у паўтары хвіліны стаіць вялікая праца. Сумесна з галоўным і асабістым трэнерам падбіраецца музыка, на гэта ідзе вельмі шмат часу. З нашымі вобразамі працуюць трэнеры-пастаноўшчыкі, дапамагаюць кожнай гімнастцы падабраць нешта сваё. Важна адчуць тое, што ты выконваеш, а потым ужо асвойваць элементы. Пасля выбару музыкі і прадмета шыецца купальнік. У нас яны вельмі дарагія, каля тысячы-паўтары долараў.

Вельмі доўга вучылася рабіць сабе макіяж і ідэальную гульку, спачатку гэта, вядома, было жудасна. Дапамагалі трэнеры, харэограф, усе хто мог. А ў звычайным жыцці лічу за лепшае быць без макіяжу.

Напярэдзе нашу зборную чакае этап Кубка свету ў Берліне, Сусветныя гульні ва Уроцлаве і этап Кубка свету ў Мінску.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

■ Жыццёвінкі

УЧОРА І ЗАЎТРА

«ЗГУБЛЕНЫЯ» ГРОШЫ

Старэнькая і адзінокая Клаўдзія Пятроўна вярнулася дадому з крамы, села ў прыхожай на зэдлік, каб аддыхацца, а заадно паглядзець, што ў яе там засталося ў кашальку. Яна заўсёды так рабіла пасля наведвання крам. І — зніякавела: у кашальку было пуста. Яна ж добра помніла, што трымала ў руках пяцьдзясят рублёў адной купюрай, каб разлічыцца за пакупкі, а калі тая не спатрэбілася, запіхнула яе назад у кашалёк. Усё ж засумнявалася: а можа, і не, можа, не так усё было? Калі ж памяць цяпер — ну яе! Хутка забудзеш, як цябе самую звуць. Клаўдзія Пятроўна перапальчыла ўсюды, дзе магла б, на яе думку, быць тая пяцідзесяцірублёвая купюра, усе кішэні вывярнула, аднак дарэмна: няма, хоць ты плач. Яшчэ да пенсіі далекавата, а засталася без грошай. Хаця прадукты ёсць, а на хлеб ды малако, так і быць, рашыла, пазычыць у людзей. Таму крыху супакоілася, але ўсё ж, выйшаўшы на двор, падзялілася бядой з суседзямі, якія сабраліся перад ганкам і абмяркоўвалі нейкую, мабыць, цікавую і надзённую навіну, бо так у гурт яны збіваюцца рэдка. Павіталася з імі, паслухала, пра што яны гамоняць, а потым і пра свае грошы апавяла...

— Згубіла недзе. Ажно пяцьдзясят рублёў. Пайду, мо дзе на тратуары ляжаць? — сказала бабулька і адразу ж пашкадавала, бо нехта з суседзяў падняў яе памкненне на смех: маўляў, ну ты і даеш, суседка, як жа будуць грошы ляжаць, калі ты іх і згубіла, як сама кажаш, і цябе чакаць. Не забывай, у які час жывеш!..

Яна і не пайшла. Відаць, праўду кажа сусед-мужчына. Вярнулася ў кватэру, каб менш думаць пры тыя згубленыя грошы, уключыла тэлевізар. Зацікавілася перадачай і на пэўны час забылася пра страту. А тут якраз дзынкнуў званок. «Хто б мог быць?» Адчыніла. На парозе стаяў сусед — той, што пакпіў з Клаўдзіі Пятроўны, калі яна сабралася пайсці шукаць згубленыя грошы.

— Скачы, Пятроўна! — ён трасянуў у паветры купюрай. — Ты і сапраўды іх згубіла. Але не на тратуары, а ў пад'ездзе, якраз за дзвярыма, дзе ў нас заўсёды цёмна, — святла ад лямпачкі ў калідоры не хапае. А ў мяне ж зрок не тое, што ў цябе. На, трымай свае грошы і болей не губляй.

— Во, дзякуй табе, суседзе, цяпер я да пенсіі спакойна дацягну, — рукі ў бабулькі затрэсліся, яна ўзяла грошы, пакланілася суседу.

Той не ацаніў яе паклон, сказаў без дакору, цёпла:

— Ну, ну, Пятроўна. Будзе табе. Мы ж з Косцікам тваім раслі разам. Хоць і не былі вялікімі сябрамі, але ж... я помню яго. Шкада, што рана не стала... А я, як бачыш, ёсць. Жыву... Хто ж, калі не мы, жывыя... Даруй, цётка... Мне трэба ісці...

...Свае пяцьдзясят рублёў Клаўдзія Пятроўна знайшла на другі дзень у сваім жа кашальку. Там, аказваецца, столькі перагародак, што і малады заблудзіцца...

СВАЯК

У гэта цяжка паверыць, але такое было. Я добра ведаю таго чалавека, ён не выдумшчык і не фантазёр нейкі, а салідны таварыш, які доўгі час займаў высокую пасаду і меў аўтарытэт у нашым горадзе.

— Сустракаю на адным мерапрыемстве Івана Андрэевіча, гэта да маёй пенсіі было, — так пачаў ён са мной гамонку. — Павіталіся. Камплімэнтамі абмяняліся. А тады ён, паважаны прафесар, вазьмі ды заяві мне: «Вы толькі не крыўдуйце, але скажу вам шчыра — ох і намучыліся мы з вашай сваячкай! Тройчы збіраліся адлічыць, але ж кожны раз прыбягаў яе бацька і такі лямант узнімаў, што дзе там! «Вы ведаеце, хто ў мяне сваяк?!» І называў ваша прозвішча. Адным словам, адступалі, праяўлялі слабасць. Выпусцілі з горам папалам...» Тут я, пачуўшы такое, не толькі здзівіўся, але і насцярожыўся: колькі жыву, ніколі пратэкцыі не рабіў, нават для сваіх дзяцей. Што за сваячка? Адкуль? Хто за дэтэктыў такі? Як прозвішча? Прафесар назваў... Яно мне ні аб чым не гаварыла. І як ні стараўся ўспомніць-прыгадаць, што ж гэта ў мяне за радня такая абвясцілася, нічога ў мяне не атрымалася. Ужо дома з жонкай расставілі, як кажуць, усе кропкі над «і». Аказалася, дачка зводнага брата траюраднай сястры жонкі майго старэйшага сына. Ні я, ні жонка, прызнаюся, не маглі нават успомніць, ці бачылі хоць тую студэнтку. Ды што студэнтку — яе бацьку таксама. А яно вось што дзеецца на белым свеце! Ну, і як такое назваць?

Мой знаёмы памаўчаў крыху, павадзіў галавой па баках, нібы асцерагаючыся кагосьці, а тады падняў на мяне вочы:

— Бываюць жа такія спрытнюгі! Бываюць жа такія лаўкачы! Ну, што скажаш, пісьменнік?

Я развёў рукамі. Я не знайшоў слоў. І нават не стаў пытацца, ці працуе тая дзяўчына, цяпер ужо, вядома ж, жанчына, настаўніцай. Бо гэтага не ведаў і ён сам...

ДАПАМОГ...

Якаў Фёдаравіч жыве ў Мінску, ваенны пенсіянер, а яго бацька закончыў свой зямны шлях у Гуце, адкуль ідзе іх радавод. Паколькі стары дажываў век у вёсцы адзін, то сын быў частым госцем у яго: дапамагаў, як кажуць, араць-сеяць і ўраджай збіраць. І ў той вясновы дзень Якаў Фёдаравіч наведаўся на бацькаўскі поплаў — трэба было садзіць бульбу. Дзялянку адвялі пад яе невялікую, таму рашылі не дамаўляцца з канём, а зрабіць справу пад заступ. «Каго б толькі яшчэ запрасіць? — падумаў Якаў Фёдаравіч. — З бацькі ўжо памагаты кепскі, сваё аддаў зямлі... А што, калі Грышку паклікаць, усё ж стрыечны брат? Папрашу яго» . Грышка выслухаў, паабяцаў быць як штык. Толькі чакаў-чакаў яго Якаў Фёдаравіч, а таго нешта няма. Занепакоіўся: «Можа, ён не так мяне зразумеў?» І патупаў у другі канец вёскі. Тое, што ўбачыў на дварэ ў Грышкі, дало адказ на ўсе пытанні: Грышка быў п'яны. Ды настолькі п'яны, што не зразумееш, аб чым ён балаболіць. Да таго ж хаатычна ходзіць па дварэ, хістаецца. «І калі паспеў?» «Што ж, давядзецца садзіць бульбу аднаму. Нікуды не падзенешся»,— развёў рукамі гараджанін.

Калі пакідаў двор, Якава Фёдаравіча перахапіла Грышкава маці і, асцярожна зіркаючы па баках — ці не бачыць Грышка? — шапнула яму:

— Ты ўжо даруй, Яша. Гэта ж ён прыкінуўся п'яным. Я б табе сама дапамагла, але ж ён потым мяне з'есць...

ЛІТАРАТУРНАЕ СВЯТА

Пісьменніка Юрася Антонавіча запрасілі ў паездку на літаратурнае свята ў аддалены раён вобласці. Спярша ён адмовіўся, спасылаўся на ўзрост і на стан здароў'я, аднак яго ўгаварылі: як жа так, Юрась Антонавіч, без вас?! Вы ж — геній, наш гонар, самы заслужаны пісьменнік у вобласці. Ды што ў вобласці — уся краіна на вас раўняецца! Адных толькі званняў у вас — ого колькі! А кніг! А спектакляў! Так што і не думайце адмаўляцца.

З'ездзіў. Праз колькі дзён прыйшла газета, дзе была надрукавана справаздача аб тым літаратурным свяце. На паўпаласы. Такога ж памеру і здымак, на якім былі ўсе члены пісьменніцкай арганізацыі, калі ім ўручалі на мяжы раёна хлеб-соль. Не было на тым здымку толькі... Юрася Антонавіча. Першай гэта заўважыла жонка, падняла на мужа загадкавы позірк:

— А ты што, не ездзіў?

— Як не ездзіў?!

— Прызнавайся, дзе быў? Ці, можа, сівізна ў бараду, а чорт — у гаславу? Так?

— Дай сюды газету, — ледзь не выхапіў яе з рук жонкі. — Зараз разбяромся. Ага, мяне і сапраўды не відаць... Я, мусіць, вунь за той калонай стаю. Пачакай, пачакай...

Юрась Антонавіч сеў, не выпускаючы газету з рук, і ўспамінаў, як усё было, калі фатаграфаваліся. Жонка ўжо махнула на яго рукой і падалася на кухню, а ён сказаў ёй услед:

— Ты ведаеш, Марыя, у чым тут справа? Як падалі каманду сфатаграфавацца, усе кінуліся на злом галавы бліжэй да фатографа... Ну і «замялі» мяне. Заціснулі.

Ён памаўчаў трохі, а сам падумаў: «Каб жа яны так беглі ў выдавецтвы з новымі творамі, як бягуць, каб пакрасавацца перад камерай. Але ж туды трэба з нечым бегчы, штосьці мець... Хоць адна ў іх, небарак, радасць — засвяціцца... Хоць дзе. Любым чынам. То вось так, як цяпер, на гэтым здымку, то ў тых жа «Аднакласніках». А таго не разумеюць, што чытач глядзіць не на картку, а на кнігу і на тое, што ў той кнізе...»

РАЗУМНАЯ ЎНУЧКА

Маша прачнулася, ляжала пад коўдрай і чула, як мама размаўляла па тэлефоне з дзядулем. Дзядуля жыве ў іншым горадзе. Але што цяпер адлегласць! Вось і сёння дзяўчынка зразумела, што зараз яна будзе размаўляць з дзядулем па скайпе, ды не проста размаўляць, а той будзе няньчыць яе. Маме трэба тэрмінова некуды збегаць, а сваю любімую дачушку адну пакінуць дома не рашаецца: ці мала што!.. А гэта, можа, і лепш: затое Маша зноў нагаворыцца са сваім любімым дзядулем! А заадно яна пакажа яму сваіх новых лялек, якіх прывёз ёй з камандзіроўкі тата. Тата працуе на Поўначы, здабывае ў тайзе нафту, і калі прыязджае дадому, то не з пустымі рукамі: радуе дзяўчынку новымі падарункамі. З татам Маша амаль кожны дзень размаўляе ўвечар. А зранку тата на працы. Затое дома дзядуля, ён пенсіянер і яму няма куды спяшацца. Хіба як да камп'ютара, каб пабачыцца з унучкай Машай.

І вось яны, дзядуля і дзяўчынка, сядзяць перад маніторамі і размаўляюць. Размова заўсёды пачынаецца ў іх так:

— Добрай раніцы, Маша!

— Добрай раніцы, дзядуля!

— Ну, расказвай, што бачыла сёння ў сне, што рабіла ўчора ў садку.

Але гэтым разам, перш чым адказаць на дзядулевы пытанні, дзяўчынка весела спыталася:

— А ведаеш, дзядуля, хто мы з табой?

— Цікава. Ну і хто ж?

— Аднаскайпнікі!

Дзядуля ўсміхнуўся: малайчына, Маша! Удалае, трапнае параўнанне. Бач ты, прыдумала ж.

— Сама здагадалася?

— Ага!

Дзядуля яшчэ ўсміхнуўся і таму, што разумная ўнучка ў яго расце. А які дзядуля такому не парадуецца?

Васіль ТКАЧОЎ

Сканворд



Праверце, калі ласка, адказы

Па гарызанталі: Пуп. Фільм. Архіў. Мадам. Вада. Улоў. Шар. Кіёск. Яма. Квас. Залп. Дока. Кніга. Папера. Амар. Рака. Аса. Лодар. **Па вертыкалі:** Праца. Пахвала. Фаўн. Мікраскоп. Маляр. Душа. Морква. Аліса. Казан. Лаг. Клема. Спёка. Карал. Адвар. Пара. Рак.

Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, *г. Мінск.*

■ Шлях веры

КАШТОЎНАСЦЬ ДУХОЎНАГА

Набажэнства ў гонар абраза Маці Божай адбылося ў Будславе

30 чэрвеня і 1 ліпеня ў Будславе Мядзельскага раёна ў касцёле-санктуарыі пры вялікай колькасці паломнікаў, святароў і гасцей з навакольных вёсак і гарадоў адбылося ўрачыстае штогадовае набажэнства ў гонар абраза Маці Божай Будслаўскай. Сёлета ўрачыстасці прайшлі пад знакам 100-годдзя аб'яўлення Маці Божай Фацімскай. На пляцоўках каля касцельных сцен адбыліся канцэрты духоўнай музыкі, а ноччу і днём на прыкасцельнай плошчы прайшлі працэсіі з запаленымі свечкамі і з фігурнай выявай Маці Божай Фацімскай. Урачыстая служба праходзіла пры ўдзеле Архіепіскапа Тадэвуша Кандрусевіча, Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара

Даты Падзеі Людзі

4 ЛІПЕНЯ

1790 год — нарадзіўся сэр Джордж Эверэст, брытанскі геадэзіст. Выканаў тапаграфічную здымку тэрыторыі Індыі і першым вызначыў вышыню самай высокай вяршыні свету — Джамалунгмы, якая і была названая Эверэстам у яго гонар.

1807 год — нарадзіўся Джузэпэ Гарыбальдзі (1807—1882), знакаміты італьянскі рэвалюцыянер, палкаводзец, народны герой Італіі.

1900 год — з Кранштата на пошукі міфічнай Зямлі Саннікава выйшла шхуна «Заря» акадэмічнай Рускай палярнай экспедыцыі пад кіраўніцтвам вядомага даследчыка Арктыкі барона Эдуарда Васілевіча Толя (1858—1902). Упершыню аб загадкавым востраве паведаміў у 1811 годзе зверапрамысловец Якаў Саннікаў, які займаўся здабычай пясца на паўночных берагах Новасібірскіх астравоў. Дасведчаны палярны падарожнік, які раней адкрыў астравы Сталбавы і Фадзееўскі. Ён выказаў думку аб існаванні «шырокай зямлі» на поўнач ад вострава Кацельнага. Па словах паляўнічага, над морам уздымаюцца «высокія каменныя горы». Менавіта на яе пошукі была накіравана арктычная экспедыцыя барона Толя, перакананага ў існаванні Арктыды — паўночнага палярнага кантынента. 13 жніўня Толь убачыў контуры чатырох гор, якія на ўсходзе злучаліся з нізіннай зямлёй. «Такім чынам, паведамленне Саннікава пацвердзілася цалкам, — пісаў палярнік у сваім дзённіку. — Мы маем права, такім чынам, нанесці ў адпаведным месцы на карту пункцірную лінію і напісаць на ёй: «Зямля Саннікава»...» Аднак у 1938 годзе савецкія лётчыкі даказалі, што Зямлі Саннікава не існуе. На думку даследчыкаў, яна, як і многія арктычныя астравы, была складзена не са скал, а з вечнай мерзлаты, па-над якой быў нанесены пласт грунту. У пачатку XX стагоддзя лёд растаў, і Зямля Саннікава знікла.



1904 год — нарадзіўся (г. Бяроза, цяпер Брэсцкая вобл.) Анатоль Адамавіч Альшэўскі, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, публіцыст. З 1925 года на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. Быў рэдактарам друкаваных органаў ЦК КПЗБ «Бальшавік» і «Чырвоны сцяг». У 1927 годзе арыштаваны польскімі ўладамі, з 1928 года — у СССР па абмене палітычнымі вязнямі. З 1932 года працаваў у рэдакцыі Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б у Мінску, на прафсаюзнай рабоце. У публіцыстычных артыкулах выкрываў антыбеларускую палітыку ўрада Польшчы. У 1937 годзе рэпрэсіраваны, у тым жа годзе памёр. Рэабілітаваны пасмяротна.

1920 год — падчас савецка-польскай вайны пачалася ліпеньская аперацыя войск Заходняга фронту, у выніку якой да 1 жніўня ад польскіх захопнікаў была вызвалена амаль уся тэрыторыя Беларусі.

1927 год — нарадзілася Джына Лалабрыджыда, славутая італьянская актрыса кіно. Здымалася ў фільмах «Фанфан-Цюльпан», «Рымлянка» і многіх іншых. Вядомая як майстар мастацкай фатаграфіі і скульптуры.

1954 год — у Мінску на плошчы Перамогі адкрыты манумент Перамогі — помнік у гонар воінаў Савецкай Арміі і беларускіх партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Ён стаў сімвалам сталіцы Беларусі. З ліпеня 1961 года каля падножжа манумента запалены Вечны агонь.

Было сказана

Георгій МАРЧУК, пісьменнік, публіцыст:

«У жыццё прыходзім выпадкова, сыходзім заканамерна».

■ Космас

Самая старая планета Сонечнай сістэмы

Навукоўцы высветлілі па ізатопным складзе метэарытаў, што самая старая планета Сонечнай сістэмы — Юпітэр. Гэты гігант з'явіўся ў першы мільён гадоў пасля таго, як запалілася Сонца, а ўсе астатнія планеты — нашмат пазней.

Хто ў Сонечнай сістэме старэйшы? Вядома, Сонца: з яго нараджэння 4,6 мільярда гадоў таму пачалася гісторыя нашай планетнай сістэмы. А за ім з дыска акрэсці — кучы камянёў і пылу, якія ляталі навокал нованароджанага Сонца, — з'явіўся Юпітэр. Да такой высновы прыйшла міжнародная група навукоўцаў, якая працуе ў Ліверморскай нацыянальнай лабараторыі.

Планетолагам даўно стала зразумела, што першымі павінны былі сфарміравацца планеты-гіганты — Юпітэр, Сатурн, Уран і Нептун, а ўжо следам за імі — маленькія планеты зямной групы — Меркурый, Венера і Зямля. Але пытанне аб тым, хто з газавых гігантаў быў першы, заставалася адкрытым. Ніякіх проб рэчываў з аб'ектаў, размешчаных далей за пояс астэроідаў, у чалавецтва ў распараджэнні пакуль няма, таму, каб адказаць на пытанне аб тым, якая з планет Сонечнай сістэмы самая старая, навукоўцы вывучалі не самі планеты-гіганты, а метэарыты — іх у нас дастаткова.

Ізатопны аналіз паказаў, што ўсе метэарыты выразна дзеляцца на дзве групы; навукоўцы выказалі здагадку, што такая выразная розніца ў саставе можа казаць аб тым, што метэарыты фарміраваліся з двух вельмі розных аблокаў газу і пылу. Кожнае такое воблака калісьці знаходзілася ў межах Сонечнай сістэмы. Матэматычная мадэль фарміравання Сонечнай сістэмы паказала, што два такія аблокі маглі ўтварыцца, калі следам за Сонцам сфарміравалася вельмі вялікая і цяжкая планета, якая сваёй гравітацыяй расчысціла сабе шлях у знешнім каля Сонца дыску з вялікіх і маленькіх камянёў, газу і пылу, падзяліўшы гэты дыск на дзве часткі. Згодна з мадэллю, усё адбывалася ў першы мільён гадоў існавання Сонечнай сістэмы, практычна адразу пасля таго, як запалілася Сонца. Праз 4,5 мільярда гадоў газавыя гіганты, якія канчаткова сфарміраваліся, выштурхнулі ўсё рэчыва былога акрэцыйнага дыска, што застаўся па-за арбітай Юпітэра, у пояс астэроідаў. Там халодныя кавалкі лёду і каменя налятаюць адзін на аднаго, сутыкаюцца і разлятаюцца на меншыя кавалкі. Некаторыя з аскепкаў далятаюць да Зямлі — так мы атрымліваем вестачкі аб тым, што адбывалася ў Сонечнай сістэме задоўга да з'яўлення нашай планеты.

Даследаванне апублікавана ў часопісе Proceedings of the National Academy of Sciences, коратка пра яго расказвае прэс-рэліз Ліверморскай нацыянальнай лабараторыі

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЛІПЕНІ

4, аўторак, *14.00—16.00*

6, чацвер, *20.00—22.00*

9, нядзеля, *12.00—14.00*

10, панядзелак, *21.30—23.30*

16, нядзеля, *8.00—10.00*

17, панядзелак, *10.30—12.30*

19, серада, *12.00—14.00*

23, нядзеля, *10.00—12.00*

25, аўторак, *14.30—16.00*

31, панядзелак, *18.00—20.00*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.45	21.43	16.58
Віцебск	4.26	21.41	17.15
Магілёў	4.34	21.33	16.59
Гомель	4.40	21.21	16.41
Гродна	5.02	21.56	16.54
Брэст	5.11	21.48	16.37

Месяц

Першая квадра 1 ліпеня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Георгія, Максіма, Паўла, Юльяна.* ***К.*** *Альжбеты, Мальвіны, Андрэя, Інакенція, Тодара.*

Фота Надзеі БУКАН.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

«Шкада, што сёння яшчэ толькі чацвер...» — падумаў песіміст.

«Ваў! Сёння ўжо чацвер!» — падумаў аптыміст.

«Як жа вы мне надакучылі, алкаголікі праклятыя», — падумала печань.

Калі вам у бары ўсміхнулася дзяўчына — відавочна, не мае грошай.

А калі вы ўсміхнуліся ў адказ — відавочна, у вас грошы ЯШЧЭ ёсць.

Малюнак Сяргея ВОЛКАВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2500.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 ліпеня 2017 года.